

Эліта Узброеных Сіл

СТАР. 3



Каб вочы бачылі

СТАР. 6



Як у сталіцы шукалі каханне

СТАР. 8



Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 лютага 2015 г. СЕРАДА № 31 (27889) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ВАЖНЫ ЭКАНАМІЧНЫ СКЛАДНІК

### Аляксандр Лукашэнка мае намер наведаць у хуткім часе Іран

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі заявіў на сустрэчы з міністрам замежных спраў Ірана Махамадам Джавадам Зарыфам, паведамляе БЕЛТА. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў час маючага адбыцца візіту мае намер зрабіць упор на эканамічным складніку адносін Беларусі і Ірана. «Нашы палітычныя, дыпламатычныя адносіны знаходзяцца на беспрэцэдэнтна высокім узроўні, што не скажаш аб эканамічных. Таму ў час гэтага візіту галоўны ўпор мы хацелі б зрабіць на эканоміцы, і, зразумела, праграма візіту павінна быць напоўнена эканамічным зместам», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з Іранам. Паводле яго слоў, сведчаннем таго з'яўляюцца інвестыцыі Ірана ў беларускую эканоміку. У прыватнасці, у беларускія праекты ўкладзена больш за $600 млн. Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што апошнім часам з-за, у тым ліку і аб'ектыўных прычын, адзначаецца пэўнае тармажэнне ў рэалізацыі гэтых праектаў, нягледзячы на тое, што беларускі бок заўсёды ішоў насустрач іранскім партнёрам, прадастаўляючы лепшыя ўмовы. «Хачу запэўніць, што мы заўсёды будзем свята прытрымлівацца нашых дамоўленасцей і будзем рабіць усё для таго, каб нашы партнёры ў Беларусі адчувалі сябе надзейна», — падкрэсліў беларускі лідар. «Мы перажываем яшчэ складаныя часы. Іран, як і Беларусь, зведвае знешняе ўздзеянне, прымяняюцца па асобных напрамках санкцыі ў адносінах да вашай краіны, гэтак жа, як некалі было, ды і існуе цяпер, у адносінах да нашай краіны. Але тым не менш, у гэтай сітуацыі мы можам паказаць узор супрацоўніцтва дзяржаў», — лічыць Прэзідэнт Беларусі. У сваю чаргу міністр замежных спраў Ірана перадаў прывітанне ад Прэзідэнта гэтай краіны Хасана Раўхані, адзначыўшы, што ён чакае візіту кіраўніка беларускай дзяржавы. Махамад Джавад Зарыф таксама звярнуў увагу на тое, што Беларусі і Ірану неабходна ўзнімаць узровень эканамічных адносін.

■ Знешняя палітыка

**Міністр замежных спраў Ірана:**

## «ВАША КРАІНА ІГРАЕ ВАЖНУЮ РОЛЮ ВА УСХОДНЕ-ЕЎРАПЕЙСКІМ РЭГІЁНЕ»

Учора **міністр замежных спраў Ісламскай Рэспублікі Іран Махамад Джавад ЗАРЫФ** сустрэўся з **міністрам замежных спраў нашай краіны Уладзімірам МАКЕЕМ і старшынёй Савета Рэспублікі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ.** Асноўнай тэмай перамоў стала паглыбленне супрацоўніцтва ў розных сферах.

— Падчас перамоў у вузкім і пашыраным складах мы падвялі вынікі развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння ў мінулым годзе, грунтоўна абмеркавалі далейшыя крокі па інтэнсіфікацыі беларуска-іранскага супрацоўніцтва на 2015 год, — паведаміў Уладзімір Макей. — У мінулым годзе вельмі дынамічна развіваліся нашы палітычныя кантакты, гандлёва-эканамічныя адносіны. Па беларускай статыстыцы, аб'ём узаемнага гандлю таварамі і паслугамі па выніках мінулага года склаў 130 мільёнаў долараў. Але гэта не мяжа. Мы лічым, што патэнцыял нашага гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння цалкам не выкарыстаны. Гэты паказчык павінен з'яўляцца адпраўным пунктам для нашага далейшага супрацоўніцтва.

Па словах міністра замежных спраў нашай краіны, дыпламаты дамовіліся больш увагі надаваць развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

— У гэтым плане мы намецілі шэраг канкрэтных крокаў: у прыватнасці правядзенне чарговага пасяджэння Сумеснай міжурадавай камісіі і іншыя праекты.

Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства выказаў упэўненасць, што будучыня ў беларуска-іранскіх адносінаў вельмі добрая.

— На жаль, сёння існуюць пэўныя абмежаванні з боку трэціх краін, якія не дазваляюць нам у поўнай меры разгарнуцца і рэалізаваць патэнцыял нашага двухбаковага ўзаемадзеяння, — адзначыў міністр замежных спраў Беларусі. — Нашы перамовы мы прысвяцілі таму, каб выпрацаваць магчымыя ў дадзенай сітуацыі напрамкі, сферы нашага супрацоўніцтва, у першую чаргу ў гандлёва-эканамічнай галіне, якія дазволяць нам вывесці паказчыкі тавараабароту на больш высокі ўзровень.

У сваю чаргу Махамад Джавад ЗАРЫФ заўважыў, што Беларусь іграе важную ролю ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, асабліва ў плане вырашэння канфлікту ва Украіне. Ён выказаў спадзяванне, што дасягнутыя ў Мінску дамоўленасці ў рамках сустрэчы «нармандскага фармату» будуць садзейнічаць урэгуляванню складанай сітуацыі.

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня верхняй палаты беларускага парламента,** вітаючы міністра замежных спраў Ірана, выказаў задаволенасць ходам перамоў з гэтай краінай.

СТАР. 2

## Паехалі!



Сёння распачынаюцца спаборніцтвы страляючых лыжнікаў на чэмпіянаце свету па біятлоне сярод юнакоў і юніёраў у Раўбічах. Учора перад урачыстай цырымоніяй адкрыцця, якая адбылася позна ўвечары, беларускія і замежныя спартсмены правялі адкрытую трэніроўку непасрэдна на раўбіцкіх трасах.

Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## Больш за 30

***законапраектаў будзе падрыхтавана і ўнесена ў беларускі парламент у 2015 годзе. Гэты план зацверджаны адпаведным указам Прэзідэнта. У прыватнасці, сярод дакументаў абазначаны асобны закон «Аб абыходжанні з жывёламі», які павінен быць падрыхтаваны ў маі і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў у верасні. На чэрвень намечана падрыхтоўка закона «Аб экспартным кантролі», унясенне ў парламент чакаецца ў кастрычніку. У плане таксама прапісана падрыхтоўка Кодэкса Беларусі аб культуры, унясенне ў парламент запланавана на красавік. Прадугледжваецца карэкціроўка некаторых дзеючых законаў. Асобны блок законапраектаў будзе падрыхтаваны ў адпаведнасці з рашэннямі Прэзідэнта і міжнароднымі дагаворамі Беларусі.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.02.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14910,00 | ▲ |
| Еўра | 16930,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 238,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 563,71 | ▼ |

■ Па сутнасці справы

## ПАПРАВІМ «ЗДАРОЎЕ» ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЮ

### Сярод вытворцаў сучаснай тэхнікі ідзе барацьба за якасць — умовы выхаду на рынак становяцца больш жорсткімі

79th GM MINSK 2015

**Некаторыя вучоныя лічаць, што чым больш грамадства спажывае электраэнергіі, тым больш яно развітае. Можа быць, і так. У любым выпадку, з кожным годам, дзякуючы тэхнічнаму прагрэсу, у нас з'яўляюцца ўсё новыя і новыя электрычныя прыборы і прыстасаванні. Сярод іх шмат патрэбнага і не вельмі, многае эканоміць наш час і спрашчае жыццё. Без асобных агрэгатаў мы ўвогуле не ўяўляем сабе існаванне цывілізаванага чалавека. Электроніка літаральна абляпіла нас з усіх бакоў. Тут націснуў кнопачку — зварылася кава, там націснуў — пагрэўся сняданак, стукнуў па клавішы — звязаўся з сябрам з іншага кантынента і разам з ім паснедаў анлайн. А ў кожным кутку стаяць то халадзільнік, то пральная машына, то тэлевізар...**

Усё гэта стане абсалютна бескарысным без электрычнасці. І без агульных стандартаў вытворчасці тэхнікі. Да такой няхітрай высновы чалавецтва прыйшло адразу пасля з'яўлення адпаведных прыстасаванняў. Таму ў 1906 годзе была створана Міжнародная электратэхнічная камісія (МЭК) — некамерцыйная арганізацыя, якая мае на мэце садзейнічанне міжнароднаму гандлю шляхам глабальнай стандартызацыі і ацэнкі адпаведнасці ў галіне электрычных, электронных і сумежных тэхналогій. А Генеральная асамблея МЭК — найбуйнейшы бізнес-форум, дзе збіраюцца прадстаўнікі сусветных кампаній-вытворцаў ад інжынераў і менеджараў да самага высокага кіраўніцтва. Мерапрыемства таксама называюць «тэхнічнай Алімпіядай». Чарговая Генасамблея будзе праходзіць з



5 па 16 кастрычніка ў Мінску. Пра МЭК, яе значэнне, важнасць правядзення асамблеі ў нашай краіне карэспандэнту «Звязды» распавядае **дырэктар ААТ «БЕЛЛІС», сакратар Нацыянальнага камітэта МЭК Беларусі Юрый ПАШЫК:**

— Як вы лічыце, кім лепей быць — бедным, але здаровым, ці багатым, але хворым? Народная мудрасць сцвярджае, што лепей быць багатым і здаровым. Пад гэтым ракурсам можна разглядаць і МЭК. Мы шмат гаворым аб мадэрнізацыі, тэхнічным развіцці, інвестыцыях, экспарце прадукцыі, інжынірынгу, аб тым месцы ў сістэме сусветнага бізнесу, якое павінна заняць Беларусь (не маючы вялікіх прыродных рэсурсаў). На мой погляд, апошняе нават нам на карысць, бо мы маем добрую інжынерную і прамысловую школу. Так, сёння не ўсе нашы прадпрыемствы ў выдатным стане, у кожнага з нас ёсць пэўнае пачуццё незадаволенасці. І МЭК — гэта пункт апоры для развіцця: як для асобнага чалавека, прадпрыемства, так і для краіны ў цэлым. У выніку гэта выліваецца ў дабрабыт. Каб быць і здаровымі і багатымі.

СТАР. 5




## ЗАНЯТКІ ПАТРЫЁТАЎ

**Сёння на старонках «Плацдарма» мы распачынаем новую рубрыку. «Адкрыты ўрок: стыль мілітары» — сумесны праект Выдавецкага дома «Звязда» і Ваеннага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр». Штомесяц разам з вучнямі старшых класаў мы будзем наведваць вайсковыя часці і злучэнні Узброеных Сіл нашай краіны. Спадзяёмся, гэта будзе карысна тым, хто вырашыў звязаць сваё жыццё з арміяй. Калі ж не, то знаёмства з родамі і відамі войскаў, з тонкасцямі вайсковага жыцця, афіцэрамі, якія штодзень нясуць службу, таксама будзе не лішнім. І, магчыма, у тых, у каго на жыццё былі зусім іншыя планы, узнікне жаданне пракласці свой прафесійны шлях у бок беларускай арміі — народнай па сваёй сутнасці.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Егіпет заклікаў ААН ухваліць міжнароднае ўмяшанне ў Лівію

Прэзідэнт Егіпта Абдэль Фатах ас-Сісі заклікаў Савет бяспекі ААН прыняць рэзалюцыі аб міжнародным умяшанні ў Лівію. «У нас няма выбару. Асабліва прымаючы пад увагу тое, што і ўрад, і жыхары Лівіі просяць нас умяшацца... Мы павінны зрабіць гэта зноў, усе разам», — заявіў егіпецкі лідар у эфіры французскага радыё Europe 1. 16 лютага егіпецкія ВПС нанеслі серыі авіяўдараў па пазіцыях баевікоў «Ісламскай дзяржавы» ў Лівіі. У выніку загінулі ад 40 да 50 ісламістаў. Авіяўдары сталі адплатай за пакаранне смерцю 21 егіпецкага рыбака, якія па веравызнанні з'яўляліся хрысціянамі-коптамі. Расправу з імі ажыццявілі радыкалы ІД.

### Поўныя вайскоўцы кітайскай арміі пазбавіліся кар'ернага росту



Народна-вызваленчая армія Кітая ўстанавіла стандарты вагі ваеннаслужачых, як паведамляе агенцтва Сіньхуа. Пры перавышэнні гэтых паказчыкаў салдат ці афіцэр можа не разлічваць на прасоўванне па службе. Дакладныя параметры не паведамляюцца. Яны зафіксаваныя ў плане рэфармавання і развіцця ваеннай фізічнай падрыхтоўкі арміі на 2015-2020 гады. «З паляпшэннем умоў жыцця і змяненнем дыеты вайскоўцы сталі жыць камфортна і прыбаўляюць у вазе», — сцвярджае эксперт Нацыянальнага інстытута абароны Кітая Лі Дагуанг.

### Унікальная праграма шпіёніць за большасцю камп'ютараў свету




Супрацоўнікі «Лабараторыі Касперскага» выявілі ўнікальную праграму, якая дазваляе ўбудоўваць шпіёнскае праграмнае забеспячэнне ў жорсткія дыскі вядучых вытворцаў, як паведамляе агенцтва Reuters. Агенцтва сцвярджае, што расследаванне паказвае на магчымую сувязь хакераў з Агенцтвам нацыянальнай бяспекі ЗША. Па словах прадстаўнікоў «Лабараторыі Касперскага», шпіёнская кампанія мае дачыненне да скандальнага сумеснага праекта ЗША і Ізраіля Stuxnet. Паводле інфармацыі экспертаў, заражаныя шкоднымі праграмамі камп'ютары былі выяўленыя ў 30 краінах свету — больш за ўсё ў Іране, потым ідуць Расія, Пакістан, Афганістан, Кітай. Мэтамі хакераў былі ўрадавыя і ваенныя ўстановы, тэлекамунікацыйныя кампаніі, банкі, энергетычныя кампаніі, спецыялісты, звязаныя з ядзернымі даследаваннямі, прадстаўнікі СМІ і ісламскія актывісты.


ISSN 1990 - 763X

15031>

9 771990 763008


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Аўсянка зніжае рызыку заўчаснай смерці

Новае даследаванне, праведзенае ў Гарвардскім універсітэце, паказала, што спажыванне цэльназерневых прадуктаў памяншае рызыку заўчаснай смерці на 9%. Так, невялікая порцыя аўсянай кашы — ключ да даўгалецця. Навукоўцы ацанілі звесткі двух буйных даследаванняў, у якіх прынялі ўдзел больш за 100 000 чалавек, як піша Zee News. У тых, якія з'ядалі не менш за 33 грамы суцэльнага збожжа штодня (эквівалентна порцыі аўсянай кашы), рызыка заўчаснай смерці была на 9% ніжэйшай у параўнанні з тымі, хто практычна не еў цэльназерневыя прадукты. Рызыка смерці ад сардэчных захворванняў зменшылася на 15%. Даследчыкі мяркуюць: суцэльнае збожжа абараняе сэрца, зніжаючы ўзроўні інсуліну і цукру ў крыві. Гэта дапамагае паменшыць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў і дыябету. Акрамя таго, цэльназерневыя прадукты багатыя на пажыўныя рэчывы і спрыяюць зніжэнню вагі.

КОРАТКА

Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў 2014 годзе склалі 100,1 працэнта да ўзроўню 2013 года.

**Мінюст прапануе забараніць рыэлтарам працаваць па перадаплаце. У 2014 годзе па выніках праверак адносна рыэлтарскіх арганізацый вынесена 11 пастаноў аб накладанні адміністрацыйных спагнанняў, 10 арганізацыям накіраваны прадпісанні аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў.**

Для людзей з недахопамі зроку і слыху будзе арганізаваны паказ «Еўрабачання-2015» з аўдыякаментарыем і субцітрамі.

**Беларуска Марына Зуева заняла 9-е месца ў масстарце з вынікам 8 хвілін 45,25 сек. на праведзеным у Херэнвене (Нідэрланды) чэмпіянаце свету-2015 па канькабежным спорце на асобных дыстанцыях.**

Першы сайт з'явіўся ў даменнай зоне *.бел.* Ім стаў сайт *домен.бел,* на якім змешчана інфармацыя аб парадку рэгістрацыі даменаў у беларускай кірылічнай зоне.

■ Сацыяльны клопат

## Перанавучыць залішні персанал і падтрымаць малазабяспечаных

### Прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі ў гэтым годзе стане клопат пра людзей, якім аб'ектыўна патрабуецца дапамога

**Аб гэтым паведаміла намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА падчас выніковай калегіі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Падтрымаюць ветэранаў, неабароненыя слаі насельніцтва, малазабяспечаных грамадзян, сем'і з дзецьмі. Што змянілася ў сацыяльнай сферы за мінулы год і як у 2015-м будуць вырашаць пытанні занятасці і дэмаграфічнай бяспекі?**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### УЗРОСТ ДЛЯ ЗАСЯЛЕННЯ Ў ДАМЫ-ІНТЭРНАТЫ ПАВЯЛІЧАЦЬ

Развіццё ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання сёння надзвычай актуальнае. Адзінокіх старых у краіне налічваецца 128 тысяч, тых, хто адзінока пражывае, — 583 тысячы. Больш за 18 тысяч чалавек знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах для старых і інвалідаў. Праўда, некаторыя пастаяльцы маюць сродкі ці забяспечаных сваякоў, каб самастойна паклапаціцца пра сябе. І пры засяленні ў дамы-інтэрнаты гэты фактар цяпер улічваецца.

— Грамадзяне, у якіх ёсць працаздольныя члены сям'і, і тыя, хто ў апошнія тры гады правёў адчужэнне нерухомай маёмасці, засяляюцца толькі на платнай аснове. На 1 студзеня 2015-га такіх людзей — 18 працэнтаў. Каб узмацніць адказнасць дарослых дзяцей за сваіх старых бацькоў, да 65 гадоў павялічаны ўзрост для засялення ў дамы-інтэрнаты на дзяржзабеспячэнне. Мяркую, што ў бягучым годзе неабходна ўзняць пытанне аб павышэнні гэтага ўзросту на 5 гадоў, а можа, і больш, — каментуе сітуацыю **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.**

СТАР. 2

■ Ва ўрадзе

# ЦЭНЫ ПАСТУПОВА АДПУСЦЯЦЬ

## А жыць трэба будзе па сродках

**У краіне запланавана паэтапнае прыняцце збалансаваных рашэнняў па зняцці абмежаванняў у цэнавым рэгуляванні, як заявіў учора прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ на пасяджэнні Савета Міністраў, дзе абмяркоўваліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за 2014 год і меры па збалансаваным развіцці эканомікі ў 2015-м.**

Прэм'ер-міністр нагадаў, што ў канцы 2014 года Беларусь сутыкнулася з сур'ёзнымі знешнімі выклікамі, якія былі звязаны ў першую чаргу са зніжэннем сусветных коштаў на нафту, на экспартуемыя нафтапрадукты і з дэвальвацыяй расійскага рубля. Свой негатыўны ўплыў аказала і эскалацыя ваеннага канфлікту ва Украіне. Андрэй Кабякоў канстатаваў, што ў выніку ўрад і Нацыянальны банк былі вымушаныя пайсці на непапулярныя меры ў сферы цэнавога рэгулявання і грашова-крэдытнай палітыкі для захавання стабільнасці ў эканоміцы і грамадстве.

«Гэтыя меры адыгралі сваю ролю і паступовa адмяняюцца пры захаванні жорсткага кантролю з боку ўрада і Нацбанка», — сказаў прэм'ер-міністр. Ён адзначыў, што ў выніку прынятых мер на валютным і дэпазітным рынках усталявалася спакойная сітуацыя. «Патрэба ў валюце на біржы задавальняецца цалкам, адкладзены попыт на валюту адсутнічае, абменнікі працуюць у штатным рэжыме», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Яшчэ адной тэмай пасяджэння стаў аб'ём крэдытавання з дзяржпадтрымкай праграм і мерапрыемстваў. Агульны аб'ём такога фінансавання ў 2015 годзе зніжаны на 25,5 трлн рублёў да 44,2 трлн. Пры гэтым будуць дабудаваныя ўсе аб'екты з гатоўнасцю не меншай за 80%, што дазволіць завяршыць ключавыя інвестыцыйныя праекты. Скарэктавана і ўнесена на ўзгадненне Прэзідэнту дзяржаўная інвестыцыйная праграма. Аб'ём фінансавання па ёй прапануецца аптымізаваць на 40% у параўнанні з 2014 годам, як заявіў прэм'ер-міністр.

Пры гэтым, распрацоўваючы праграму дзейнасці на 2015 год, урад прааналізаваў некалькі сцэнарыяў развіцця, зыходзячы з сітуацыі ў свеце. Праведзены кансультацыі з партнёрамі Беларусі па Мытным саюзе, выпрацаваны адпаведныя меры па кожным сцэнарыі. «Аднак незалежна ад таго, які сцэнарый будзе мець месца ў жыцці, яго рэалізацыя немагчымая без выканання дзвюх асноўных умоў: жыць трэба па сродках і эфектыўнасць работы айчынных прадпрыемстваў павінна быць істотна павялічана. І гэта сёння не проста лозунгі», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. А ўвогуле, як паведаміў **намеснік міністра эканомікі Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ,** праграма дзейнасці беларускага ўрада прапануе гнуткія меры рэагавання эканомікі на знешнія выклікі.

Аднак варта памятаць, што ў 2014 годзе не была выканана большасць найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Недастаткова здавальняюча працавалі міністэрствы і аблвыканкамы. Тэмп росту ВУП склаў 101,6% пры прагнозе 103,3%. Разам з тым у мінулым годзе ўдалося захаваць рост вытворчасці ў прамысловасці (на 1,9%) і сельскай гаспадарцы (на 3,1%). У 2014 годзе было ўведзена ў эксплуатацыю каля 2,4 тыс. кв.м жылля з дзяржаўнай падтрымкай.

**Паводле інфармацыі БЕЛТА.**

# «ВАША КРАІНА ІГРАЕ ВАЖНУЮ РОЛЮ ВА УСХОДНЕ-ЕЎРАПЕЙСКІМ РЭГІЁНЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Хацеў бы адзначыць высокі ўзровень нашага палітычнага дыялогу — гэта цэлы шэраг сумесных праектаў, якія будуць рэалізоўвацца больш паспяхова пасля вашага візіту і пасля тых рашэнняў, што былі прыняты, — заявіў старшыня Савета Рэспублікі.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў актыўную і канструктыўную працу пасла Ірана ў Мінску. Па яго словах, дыпламат годна прадстаўляе інтарэсы сваёй краіны і актыўна садзейнічае развіццю ўзаемапаразумення і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

— Мы зацікаўлены ў пашырэнні супрацоўніцтва паміж парламентамі нашых краін, — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі. — У нас цесныя кантакты, выбудавана сістэма працы. У красавіку мінулага года мы прымалі парламенцкую дэлегацыю на чале са старшынёй парламента Ірана. Сапраўды, гэты візіт надаў значны імпульс развіццю нашых двухбаковых стасункаў. Будзем паглыбляць наша супрацоўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПРАЗ МЯЖУ НЕ ПРАЙШЛІ

**Дзяржаўны пагранічны камітэт Беларусі паведаміў пра спробу парушэння беларуска-ўкраінскай мяжы ў Кобрынскім раёне на ўчастку Пінскага пагранічнага атрада ў ноч на 17 лютага.**

Як расказаў карэспандэнту газеты памочнік начальніка Пінскага пагранатрада Міхаіл Бут-Гусаім, ваеннаслужачыя памежнага нараду, які нёс службу недалёка ад вёскі Лелікава, заўважылі падазроны рух і пачулі шум з украінскага боку. Памежнікі накіраваліся на гукі і ўбачылі вялікую групу людзей з коньмі. Было відавочна, што прыкладна два дзясяткі грамадзян спрабуюць незаконна перасячы мяжу. Ім прапанавалі павярнуць назад, але парушальнікі не слухаліся. Затым ваеннаслужачыя папярэдзілі, што будзе прыменена зброя, але і на гэта незаконныя візіцёры не адрэагавалі правільна. Наадварот, яны павялі сябе агрэсіўна, паскорылі крокі, выкрыквалі пагрозы. Тады вайскоўцы-памежнікі зрабілі некалькі стрэлаў уверх, і, калі гэта не дапамагло, пачалі страляць у бок парушальнікаў.

Калі няўдачлівыя гастралёры зразумелі, што ўсё сур'ёзна, яны нават пакінулі частку коней і паўцякалі туды, адкуль прыйшлі. Магчыма, што сярод парушальнікаў ёсць параненыя.

— Украінскі бок прызнаў факт парушэння мяжы, — працягнуў Міхаіл Бут-Гусаім. — Зараз інцыдэнт правяраецца нашымі спецыялістамі разам са службовымі асобамі з Луцкага пагранатрада Украіны. Цалкам верагодна, што будзе распачата крымінальная справа па фактах незаконнай спробы перамяшчэння праз мяжу тавара-матэрыяльных каштоўнасцяў.

Памочнік начальніка Пінскага пагранатрада дадаў, што на гэтым участку мяжы не раз фіксаваліся падобныя парушэнні. Але раней бывалі спробы перагнаць на наш бок адну альбо дзве галавы жывёлы, а такога масавага нашэсця парушальнікаў яшчэ не было.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ДЫРЭКТАР ГОМЕЛЬСКАЙ ПТУШКАФАБРЫКІ — ПАД ВАРТАЙ

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі падчас атрымання 50 млн рублёў у якасці хабару дырэктара прадпрыемства «Птушкафабрыка «Рассвет», што ў Гомельскай вобласці. За такія грошы кіраўнік збіраўся вырашыць пытанне аб будаўнічым падрадзе.**

Як паведамляе прэс-служба КДБ Рэспублікі Беларусь, затрыманая асоба ўжо некалькі гадоў сістэматычна прымала незаконныя грашовыя ўзнагароджванні ад кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання прыватнай формы ўласнасці за садзейнічанне ў вырашэнні пытанняў, звязаных з займаемай пасадай. Сума хабару, атрыманага былым дырэктарам птушкафабрыкі ад прадпрымальнікаў, — звыш 2,5 млрд рублёў. Па фактах заведзены дзве крымінальныя справы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПАТАНУЎ, КАТАЮЧЫСЯ НА КАНЬКАХ

**На рацэ Чаква каля вёскі Рубель на Століншчыне праваліўся пад лёд і патануў хлопчык 2000 года нараджэння.**

Мяркуецца, што ён выправіўся сюды катацца на каньках. Праз некалькі гадзін занепакоены адсутнасцю сына да ракі прыйшоў бацька, які ўбачыў на беразе асабістыя рэчы, а на лёдзе — палонку. Да прыбыцця выратавальнікаў мясцовыя жыхары самі дасталі цела дзевяцікласніка.

Па звестках сіноптыкаў, у Столінскім раёне напярэдадні здарэння чатыры дні трымалася тэмпература ад нуля да плюс пяці градусаў. У нядзелю слупок тэрмометра апусціўся да мінус двух. Выратавальнікі нагадваюць: пры тэмпературы каля 0 градусаў, якая трымаецца цягам трох дзён, лёд робіцца танчэйшым на 25 працэнтаў. Падчас адлігі першымі рызыкуюць рыбакі і непаўналетнія. Не выходзьце на нетрывалы лёд самі і не пускайце на яго дзяцей!

## ДА ТРАСЫ — ПРАМЫМ РЭЙСАМ

**У сувязі з правядзеннем 18-24 лютага чэмпіянату свету 2015 года па біятлоне сярод юніёраў і юнакоў будзе арганізаваная работа экспрэснага прыгараднага маршрута № 449бЭ «Ст. м. «Барысаўскі тракт» — «Раўбічы».**

Маршрут будзе працаваць з 8.00 да 17.35, інтэрвал руху складзе 15-20 хвілін. Выехаўшы ад станцыі метро «Барысаўскі тракт», аўтобусы будуць ісці ў накірунку вуліцы Каліноўскага. Кошт праезду складзе да Раўбічаў: ад прыпыначнага пункта «Ст. м. «Барысаўскі тракт» — 14,2 тысячы рублёў, ад «Карбышава» — 11 тысяч рублёў, ад прыпыначнага пункта «Аг. Лясны» — 6 тысяч рублёў. Білеты можна набываць на ўсіх аўтавакзалах і аўтастанцыях сталіцы, а таксама ў аўтакасах на прыпыначных пунктах «Ст. м. «Уручча», «Пл. Бангалор», «Ст. м. «Каменная Горка», «Карбышава», «Слуцкі Гасцінец». З падрабязным раскладам маршрута можна азнаёміцца на афіцыйным сайце прадпрыемства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Перанавучыць залішні персанал і падтрымаць малазабяспечаных

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Шмат увагі надаецца пытанню працаўладкавання інвалідаў (іх у Беларусі — паўмільёна чалавек). Меры дзяржпадтрымкі ў выглядзе льготнага падаткаабкладання дазволілі нашай краіне, адзінай на постсавецкай прасторы, захаваць прадпрыемствы, якія знаходзяцца ва ўласнасці грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў. Летась амаль 34 мільярды рублёў накіравалі на стварэнне працоўных месцаў для людзей з асаблівасцямі развіцця. Выдадзена 80,5 тысячы сродкаў матэрыяльна-тэхнічнай рэабілітацыі. У гэтым годзе плануюць зрабіць бясплатным рамонт пратэзаў для інвалідаў 3-й групы, якія працуюць. Па словах міністра, неабходна таксама набываць аўтатранспарт, абсталяваны пад'ёмнікамі для падвозу інвалідаў. Сёння тэрытарыяльныя цэнтры маюць 39 спецыяльных аўтамабіляў (больш за ўсё такіх машын у Магілёўскай і Гродзенскай абласцях), аднак гэтага, вядома, недастаткова.

Паступовa зніжаецца колькасць малазабяспечанага насельніцтва — 4,7 працэнта ад агульнага. За мінулы год 218 тысяч чалавек атрымалі дзяржаўную адрасную дапамогу на суму 425 мільярдаў рублёў. З 2014-га, дарэчы, у сістэме адраснай дапамогі выкарыстоўваюцца новыя падыходы, накіраваныя на прафілактыку ўтрыманства сярод працаздольных грамадзян. Так, 78 чалавекам, якія не збіраліся нічога мяняць у сваім жыцці, адмовілі ў падтрымцы. Яшчэ тысячы беларусам прапанавалі выканаць індывідуальны план па самастойным паляпшэнні матэрыяльнага стану.

### ДЛЯ КОЖНАГА РАЁНА — СВАЯ ПРАГРАМА

Летась у краіне нарадзілася амаль 119 тысяч дзяцей. Большасць малых з'явілася ў Мінску, Брэсцкай і Магілёўскай абласцях. Адметна, што 53 працэнты немаўлят — другія і наступныя дзеці. Росту нараджальнасці ў многім паспрыялі меры дзяржаўнай падтрымкі сем'яў. Толькі ў мінулым годзе на дапамогу па доглядзе дзяцей выдаткавалі 11 трыльёнаў рублёў.

— Фінансавы складнік сямейнай палітыкі важкі, — кажа Марыяна Шчоткіна. — Сёлета камітэтам неабходна актыўна ўключыцца ў працэс распрацоўкі новай нацыянальнай праграмы, засяродзіць намаганні на маніторынгу дэмаграфічнай сітуацыі на месцах. Падыходы да рашэння дэмаграфічных пытанняў трэба фарміраваць з улікам асаблівасцяў кожнага раёна, нельга дапускаць механічнага клanавання праграм.

Разам з тым. расце колькасць пажылых грамадзян. З двух з паловай мільёнаў пенсіянераў 643 тысячы працягваюць працаваць. На выплату пенсій штогод выдаткоўваецца каля 70 трыльёнаў рублёў (гэта больш за 70 працэнтаў расходаў Фонда сацабароны). Суадносіны паміж сярэдняй пенсіяй па ўзросце і прыбыткамі работнікаў падтрымліваюцца на ўзроўні 40 працэнтаў. Больш папулярным становіцца добраахвотнае пенсійнае страхаванне, якое дае магчымасць сфарміраваць накапляльную частку выплат у дадатак да дзяржаўнай. Шэраг прадпрыемстваў — МТЗ, БелАЗ, «Атлант», «Беларуськалій» — ужо ўдзельнічаюць у карпаратыўных праграмах.

### НАПРУЖАНАСЦЬ НА РЫНКУ ПРАЦЫ РАСЦЕ

У лютым колькасць вакансій практычна зраўнялася з колькасцю беспрацоўных. На 30 тысяч 900 свабодных месцаў прэтэндуюць 30 тысяч 700 незанятых грамадзян. Калі раней студзень адрозніваўся ростам патрэбы ў працоўнай сіле, то ў гэтым годзе павышэння попыту на кадры не адбылося. Змяніўся ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя — з 0,5 да 0,7 працэнта. Прычынай, праўда, стала не складаная сітуацыя з вакансіямі, а чаканы «падатак на дармаедства». Сярод незанятых грамадзян шмат тых, хто не працаваў доўгі час, асоб, што вярнуліся з ЛПП і месцаў пазбаўлення волі. Каэфіцыент напружанасці на рынку працы ў сярэднім роўны адзінцы. Аднак у асобных рэгіёнах напружанасць значна вышэйшая. Напрыклад, у Ганцавіцкім і Маладзечанскім раёнах на адно свабоднае месца прыпадаюць 4 беспрацоўныя, у Пастаўскім — 5 чалавек на вакансію, у Веткаўскім — 6.

Стала больш стратных прадпрыемстваў. У некаторых галінах складскія запасы перавышаюць сярэднямесячны выпуск прадукцыі ў 2-4 разы. Як вынік, вымушаная няпоўная занятасць вырасла амаль на 50 працэнтаў.

— У малых і сярэдніх гарадах вызваленне значнай колькасці работнікаў можа мець непрыемныя наступствы, — тлумачыць **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН.** — Таму сумесна з праграмай развіцця ААН распрацоўваецца доўгатэрміновы праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі, накіраваны на садзейнічанне занятасці і самазанятасці жыхароў такіх населеных пунктаў. Неабходна дапамагаць наймальнікам вызначаць залішні персанал, перанавучаць работнікаў, што знаходзяцца пад рызыкай звальнення. Гэту працу трэба арганізаваць на апярэджанне, каб людзі не пападалі на адкрыты рынак.

Міністэрства плануе надаць рэгіёнам больш паўнамоцтваў у рашэнні пытанняў занятасці, што дазволіць аператыўна размяркоўваць фінансавыя патокі. Магчыма, стане актуальным перагляд сістэмы страхавання ад беспрацоўя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Прырода і мы

# БЕЛАЯ — ЗНАЧЫЦЬ «ЧЫСТАЯ»

## Перш чым рэкультываваць міні-палігоны, трэба знайсці, куды дзець адходы



Фота Надзеі БУЖАН.

Эканамічнае стымуляванне, павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці, удасканаленне адміністрацыйных працэдур, рэфармаванне структуры і функцый Мінпрыроды, узмацненне інспектарскай службы, павышэнне якасці і эфектыўнасці інспектарскай дзейнасці, развіццё экалагічнай асветы — вось прыярытэтныя задачы эколагаў на 2015 год, якія былі агучаны на калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Сёлета спецыялістам прыродаахоўнай сферы давядзецца сур'ёзна папрацаваць над вырашэннем многіх актуальных экалагічных праблем. І ў першую чаргу — выканаць шэсць з дванаццаці асноўных паказчыкаў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011—2015 гады. Так, трэба знізіць на 50% плошчу палёў фільтрацыі; стварыць у гарадах з колькасцю 100 тыс. чалавек і больш сістэмы адвядзення і ачысткі паверхневага сцёку з гарадскіх тэрыторый; скараціць здабычу падземнай вады на 8-10% і на 20% — скідванне забруджвальных рэчываў у водныя аб'екты; давесці долю выкарыстання адходаў вытворчасці да 85%, а аб'ёмы выкарыстання вады на гаспадарча-пітныя патрэбы на душу насельніцтва — да 130 літраў за суткі.

### ДЫХАЦЬ — ЛЯГЧЭЙ?

Сярод асноўных вынікаў працы эколагаў можна адзначыць змяншэнне сукупных выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад стацыянарных і мабільных крыніц на 1,4% у параўнанні з ростам ВВП на 1,6%. На 6,3% знізіўся і валавы выкід ад стацыянарных крыніц, пры адначасовым павелічэнні вытворчых магутнасцяў хімічнай, цэментнай, машынабудаўнічай галін. На ўзроўні 85-90 млн тон стабілізіраваліся і выкіды парніковых газаў.

Летась прадоўжылася праца і па развіцці альтэрнатыўных крыніц энергіі — сертыфікаты атрымалі 64 устаноўкі, што працуюць з выкарыстаннем энергіі сонца, ветру і біягазу (усяго ў краіне сертыфікавана 113 такіх установак).

Сёлета прыродакарыстальнікі павінны выканаць шматлікія мерапрыемствы па ахове атмасфернага паветра, будаўніцтве, рэканструкцыі, мадэрнізацыі газаачышчальных установак, якія забяспечваюць скарачэнне выкідаў забруджвальных рэчываў не менш як на 4,4 тыс. тон.

### СМЕЦІЦЬ — САБЕ ШКОДЗІЦЬ

У мінулым годзе, дзякуючы дзейнасці цэнтралізаванай сістэмы збору і выкарыстання адпрацаваных тэхнічных маслаў больш за 4 тыс. тон гэтых забруджвальных рэчываў не трапілі ў навакольнае асяроддзе.

Між тым, па-ранейшаму існуюць праблемы ў гэтай сферы. Па словах **першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Іі МАЛКІНАЙ,** наспела неабходнасць распрацоўкі цэласнай сістэмы абыходжання з адходамі, у першую чаргу, з камунальнымі.

Сёння ў краіне пакуль не існуе поўнай альтэрнатывы палігонам, не абсталяваным неабходнымі ахоўнымі інжынернымі збудаваннямі. Такіх аб'ектаў функцыянуе каля 25%, і іх эксплуатацыя з 1 студзеня бягучага года забаронена.

Рэфармацыя падыходаў у сферы збору і ўтылізацыі адыходаў, прадухіленне захавання другасных матэрыяльных рэсурсаў, узмацненне кантролю за гэтымі працэсамі і больш суровы падыход да парушальнікаў заканадаўства — менавіта гэтыя захады павінны змяніць сітуацыю, што склалася ў сферы.

Шляхам вывазу за межы краіны сёлета павінна быць зрушана з месца і праблема назапашаных непрыдатных пестыцыдаў.

### КАРАЦЬ ЦІ ПРАДУХІЛЯЦЬ?

Летась органы Мінпрыроды праверылі 2645 суб'ектаў гаспадарання, да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 19,6 тысячы парушальнікаў на суму 14,4 млрд рублёў, выяўлена больш як паўтары тысячы фактаў прычынення шкоды навакольнаму асяроддзю на суму 16,5 млрд рублёў.

Але адсутнасць сістэмнасці ў рабоце, а ў некаторых выпадках прынцыповасці і жорсткасці падчас ажыццяўлення кантролю за выкананнем прыродаахоўнага заканадаўства нашмат зніжае яго эфектыўнасць.

— Інспектарская функцыя павінна стаць асноўнай для нашых тэрытарыяльных органаў на месцах, — упэўнена Ія Малкіна. — Мы павінны працаваць так, каб суб'ектам гаспадарчай дзейнасці было больш выгадна выконваць заканадаўства, чым яго парушаць. Ужо выпрацаваны прапановы па карэкціроўцы Адміністрацыйнага кодэкса, накіраваныя на значнае ўзмацненне адказнасці за парушэнне прыродаахоўных патрабаванняў.

Адным з асноўных аб'ектаў пастаяннага кантролю з боку эколагаў павінна стаць і навядзенне парадку ў выкарыстанні земляў, перш за ўсё меліяраваных, а таксама прадухіленне іх дэградацыі.

Па словах **намесніка прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла РУСАГА,** які прыняў удзел у пасяджэнні калегіі, пры вырашэнні праблем абыходжання з адходамі ўсё патрэбна быць разумна і выверана, без бяздумных падыходаў.

— Рэкультывавўшы мініпалігон і не стварыўшы іншага аб'екта складзіравання назапашанага рэсурсу, можна прывесці да сітуацыі, калі адходы «перакачуюць» у бліжэйшыя лясы і іншыя зручныя месцы. А потым мы будзем шукаць гэтых людзей, каб іх пакараць.

Калі чалавек забруджвае навакольнае асяроддзе ўсвядомлена, прадумаўшы, як загрузіць смецце, куды яго звезці і нікому не папасціся, да яго павінны быць прынятыя самыя суровыя меры адказнасці. Але, каб ён не трапіў у такую сітуацыю, перш мы павінны стварыць умовы для рэалізацыі яго права на выкананне прыродаахоўнага заканадаўства».

Міхаіл Русы таксама лічыць, што патрэбна пастаянна кантактаваць з органамі мясцовай і рэспубліканскай улады і даводзіць да іх экалагічную інфармацыю. Гэта паспрыяе падрыхтоўцы правільных кіраўніцкіх рашэнняў.

Яшчэ адна важная задача — супрацоўніцтва ўсіх органаў дзяржаўнага кіравання. «Чым больш мы драбнімся, тым больш ствараем «нейтральных зон», за якія ніхто не хоча несці адказнасць».

**Вераніка КОЛАСАВА**

■


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА ОТ 18.02.2015 г.

**Сведения о застройщике:** Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Щорса, 1А, пом. 15.

**Режим работы:** рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 17.30, обед с 13.00 до 14.00; выходной день – суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100934617.

**Сведения о проектах жилых домов,** введенных в эксплуатацию за последние 3 года:

1. 2011 г. – 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса в г. Минске;

2. 2013 г. – 10-этажный 7-секционный 261-квартирный жилой дом №44 по ул. Железнодорожной в г. Минске;

3. 2014 г. – 13-этажный 6-секционный 426-квартирный жилой дом №23 по пр. Дзержинского (I-пусковой комплекс (4-секции) в г. Минске;

4. 2014 – 16-этажный 2-секционный 127-квартирный жилой дом № 17.

**Цель проекта** – строительство панельного дома серии М 464М-16, в том числе 40% для сотрудников Комитета Государственной Безопасности, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в составе объекта «Многоэтажные жилые дома с объектами административно-общественного назначения в квартале жилой застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, VII этап». Жилой дом №10 по генплану.

**Сведения о сроках реализации:**

Начало строительства – сентябрь 2014 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – август 2015 г.

**У Застройщика имеются:**

- решение Мингорисполкома от 29.05.2014 № 1354 «Об изъятии, предоставлении, продлении срока аренды земельных участков, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома»;

- свидетельство (удостоверение) № 500/1355-3214 от 27.06.2014 о государственной регистрации на право временного пользования на земельный участок с кадастровым номером 500000000005006833 расположенного по адресу: г. Минск в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, площадью 0,1444 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключение от 28.02.2014 № 82-15/14;

- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 10.09.2014 г. №2-203Ж-032/14.

Договор строительного подряда с ОАО «МАПИД» № 7-10/М от 31.07.2014 г.

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, в квартале жилой застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, VII этап. Жилой дом №10 по генплану.

**Характеристика объекта:**

Объект 127-квартирный, 16-этажный крупнопанельный жилой дом серии М464М-16. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Полы – бетонное покрытие пола из линолеума на теплозвукоизоляционной основе, в санузле и ванной комнате покрытие пола из керамической плитки.

Стены межкомнатные – газосиликатные, железобетонные, оштукатуренные, в жилых помещениях, прихожих, по стенам и потолку выполняется оклейка обоев, в санузле и ванной комнате стены и потолки покрываются акриловой краской.

Остекление лоджий – по СТБ 1912 из профилей ПВХ.

Сантехническое оборудование – унитаз, ванна, раковина, счетчики холодной и горячей воды.

Система отопления и вентиляции – приборы отопления, естественная вентиляция.

Электрическое освещение – распределительная и групповая сеть.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

**Стоимость 1 кв.м** общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению Комитета Государственной Безопасности,

- для нормативной общей площади, строящейся с государственной поддержкой, – 11 541 000 белорусских рублей,

- для площади, превышающей нормативную площадь, при строительстве с государственной поддержкой, – 22 635 000 белорусских рублей.

Стоимость 1 $м^2$ общей площади объекта долевого строительства подлежит изменению (увеличению) на сумму затрат застройщика, понесенных в связи с реализацией имущественных прав собственников и сносом объектов недвижимости (индивидуальных жилых домов по ул. Щорса, д. 21, ул. Грушевская, д. 86).

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка.

**Общее имущество дольщиков** – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Прием заявлений от граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий по направлению Комитета Государственной Безопасности, осуществляется отделом маркетинга и правового обеспечения сделок с недвижимостью ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник – пятница с 8.30 до 17.30, обед с 13.00 до 14.00. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт. Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение трех календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и СЗАО «ЛадаГарант» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:** тел.: 8-017-220-40-43, VELCOM 8-029-699-40-93, 8-029-699-40-32; на сайте http://www.lada.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Щорса, 1А, комн. 305.



**УП «ИНСТИТУТ «БЕЛПРОМСТРОЙПРОЕКТ»**

**ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ**

**по выбору субподрядной организации для выполнения раздела «Автоматическое пожаротушение» по объекту: «Модернизация части производственного корпуса № 1 под автономную линию окрашивания колес по ул. Бахарова, 225 в г. Бобруйске».**

Ориентировочные сроки выполнения работ: архитектурный проект — 15 календарных дней, строительный проект — 25 календарных дней.

Срок представления предложений — **26.02.2015 г.**

Фондеранцева Наталья Семеновна, **тел. 8 017 200 28 30.**

УНП 100049147



***Уважаемые акционеры ОАО «Постторг»!***

**Открытое акционерное общество «Постторг»**

(г. Минск, ул. Клумова, 3)

**Сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров. Собрание состоится 24 марта 2015 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3, актовый зал ОАО «Постторг».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год и основных направлениях развития общества в 2015 году.

*Докладчик – генеральный директор Смольский С.А.*

2. Утверждение заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год, заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2014 год.

*Докладчик – председатель ревизионной комиссии Ведрицкая Т.В.*

3. Отчет председателя наблюдательного совета о работе в 2014 году.

*Докладчик – председатель Наблюдательного совета Миронович-Смольская Н.С.*

4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2014 год.

*Докладчик – главный бухгалтер Бурая С.Г.*

5. О распределении чистой прибыли и о дивидендах за 2014 год и направлениях использования чистой прибыли в 2015 году.

*Докладчик – главный бухгалтер Бурая С.Г.*

6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

*Докладчик – генеральный директор Смольский С.А.*

7. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

*Докладчик – генеральный директор Смольский С.А.*

8. Определение органа публикации информации ОАО «Постторг».

*Докладчик – председатель наблюдательного совета Миронович-Смольская Н.С.*

9. Об уменьшении уставного фонда общества.

*Докладчик – председатель наблюдательного совета Миронович-Смольская Н.С.*

10. Об утверждении изменений и дополнений в устав общества.

*Докладчик – председатель наблюдательного совета Миронович-Смольская Н.С.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Клумова, 3, комната №45 23 марта 2015 года с 10.00 до 16.00 либо 24 марта 2015 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания в день проведения собрания с 9.30 до 9.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 2 марта 2015 года.

УНП 100036531 *Наблюдательный совет.*


**Супрацоўнікі Выдавецкага дома «Звязда» выказваюць шчырае спачуванне спецыяльнаму карэспандэнту па Брэсцкай вобласці Святлане Яскевіч у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 2 (42)





■ Унікальнае падраздзяленне

# КАНЦЭРТ НА ПЛЯЦЫ,
## або Служба самых «модных»

### РОТА ГАНАРОВАЙ ВАРТЫ АДЗНАЧЫЛА 20-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ

**Яны заўсёды на вачах. На іх сканцэнтравана ўвага не толькі захопленых прыхільнікаў, а і кіраўнікоў дзяржаў, VIP-персон. Ад іх чакаюць новых трукаў, цікавых віртуозных рашэнняў. Яны проста не маюць права на памылку, бо гэта эліта Узброеных Сіл, твар краіны.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Каб даведацца, як гэта — трымаць марку, быць найлепшымі з лепшых, мы завіталі да іх у госці. І засталі роту ганаровай варты на пляцы. Тут высокія статныя юнакі праводзяць значную частку свайго часу. У спёку і мароз, у снег і дождж, а часам не толькі ўдзень, але і ўначы яны адточваюць кожны рух, прыдумляюць нешта новае і замацоўваюць ужо вывучаныя элементы.

#### Рост пад два метры, ідэальнае здароўе і чысціня перад законам

— Сёння цудоўнае надвор'е для трэніроўкі, — заўважае, сустракаючы нас, камандзір роты Павел Шпарла.

Гэтага высокага, прыгожага юнака ведае, напэўна, уся краіна. Гэта ён вядзе за сабой роту на кожным парадзе, першы задае тон усяму выступленню. Як прызнаецца капітан, ён ужо адчуў на сабе, што значыць быць ва ўсіх на вачах. А між тым, у роце ганаровай варты Павел, напэўна, даўжэй за ўсіх. Прыйшоў сюды ў 2009 годзе пасля заканчэння агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі. Спачатку — на пасаду камандзіра 3-га ўзвода (камандзірам роты прызначаны ў 2012 годзе). Яшчэ быўшы курсантам удзельнічаў у трох парадах. Сёння на рахунку вайскоўца іх ужо 8.

Каб трапіць у роту ганаровай варты, аднаго жадання недастаткова. Хаця, як кажа камандзір, гэта галоўны крытэрый адбору. Кандыдатаў у элітнае падраздзяленне краіны падбіраюць задоўга да прызыўной кампаніі, шукаюць ва ўсіх куточках Беларусі. Патэнцыйныя кандыдаты — рэдкія экзэмпляры. Яны павінны быць не ніжэйшымі за 185 і не вышэйшымі за 193 сантыметры, валодаць здароўем першай групы годнасці і не мець у сваёй біяграфіі ніводнага правапарушэння.

— А ці ўсе згаджаюцца служыць у роце ганаровай варты? — цікаўлюся я.

— Не заўсёды, — гаворыць Павел. — Бывае, юнак падыходзіць па ўсіх крытэрыях, але служыць тут не хоча. Многія баяцца цяжкасцяў, вялікіх нагрузак. Гэта толькі на першы погляд здаецца, што ўсё так зладжана і прыгожа. Аднак за гэтым стаіць штодзённая напружаная праца, якая патрабуе вялікіх намаганняў.

Яфрэйтар Аляксей Лукановіч ніколі не думаў, што хлопец з раённага гарадка можа трапіць у роту ганаровай варты. «Калі летам 2013 года я прыехаў у Мінск, каб паглядзець парад, то нават уявіць не мог, што праз год сам буду ўдзельнікам урачыстага шэсця», — гаворыць юнак.

— А калі мне прапанавалі пайсці служыць у роту ганаровай варты, я, шчыра кажучы, быў у шоку, — дзеліцца малодшы сяржант Дзмітрый Хявук. — Сёння я шчаслівы, што трапіў менавіта сюды. Ганаруся гэтым сам, ганарацца мае бацькі.

#### Віртуозы шашак і карабінаў

Службу ў роце ганаровай варты праходзяць 112 чалавек. Усе — салдаты тэрміновай службы. Толькі яны дасканала авалодаюць гэтым майстэрствам, як настае час звальняцца. Прыходзіць новае папаўненне — і ўсё пачынаецца наноў.

Спачатку ўчарашнія прызыўнікі засвойваюць адзіночную страявую падрыхтоўку. Потым вывучаюць базавыя элементы: страявую стойку, адданне чэсці, павароты на месцы. Затым задача ўскладняецца: салдаты засвойваюць рух страявым крокам, павароты ў руху. І толькі тады, калі вайскоўцы развучаць усе элементы страявой падрыхтоўкі, яны пачынаюць трэніравацца са зброяй. Адразу вылучаюцца тыя, хто будзе працаваць з шашкамі. Як правіла, гэта юнакі абсалютна аднолькавага росту, крыху вышэйшыя за ўсіх.

Усе астатнія ўзброены самазарадным карабінам Сіманава. Іх у вайскоўцаў па два: трэніровачны і парадны. Лёгкі на першы погляд, ён важыць чатыры кілаграмы. У гэтым давялося пераканацца асабіста. Узяўшы карабін, мая рука хутка апусцілася ўніз. А вайскоўцы, бывае, трымаюць яго гадзінамі, ды яшчэ выпрабляюць ім розныя піруэты!

— Самазарадны карабін Сіманава даўно прыняты на ўзбраенне як нашай, так і ротамі ганаровай варты многіх постсавецкіх краін, — расказвае камандзір. — У першую чаргу гэта звязана з яго эстэтычнымі якасцямі. А між тым, гэта высокадакладная зброя, якая валодае добрай далёкасцю палёту кулі.

**Цікавая дэталь: пляц-канцэрт прыдумляе не нехта канкрэтны, а ўвесь калектыў. Кожны салдат можа прапанаваць пэўны элемент, і калі ён прыгожа глядзіцца, то яго пачынаюць развучваць.**

Дарэчы, доўгачасовыя трэніроўкі з карабінам адбіраюць у юнакоў шмат сіл. Невыпадкова для іх прадугледжаны дадатковы паёк у выглядзе мяса, сала, садавіны, сокаў, кефіру, тварагу, сыру. А ў перыяд падрыхтоўкі да параду — увогуле раскоша: юнакам даюць па дзве шакаладкі ў дзень!

#### Майстры на «кветку» і «даміно»

Распарадак дня роты ганаровай варты нічым не адрозніваецца ад іншых падраздзяленняў беларускай арміі. Праўда, страявой падрыхтоўкі ў іх значна больш. Ды і замест баявых вучэнняў — выпрабаванні пляцам. Звычайна яны трэніруюцца па 5 гадзін на дзень. А перад адказнымі мерапрыемствамі праводзяць на пляцы да 6–8 гадзін у суткі.

Цікавая дэталь: пляц-канцэрт прыдумляе не нехта канкрэтны, а ўвесь калектыў. Кожны салдат можа прапанаваць пэўны элемент, і калі ён прыгожа глядзіцца, то яго пачынаюць развучваць. Вось і здзіўляюць нас на кожным парадзе. «Штогод мы імкнёмся падрыхтаваць і паказаць гледачам нешта новае», — удакладняе камандзір роты.

Аднак ёсць і нязменныя элементы, якія ўжо палюбіліся гледачам. У кожнага з іх — не толькі свая спецыфіка, а нават назва. Напэўна, мала хто ведае, што славутае пастраенне вайскоўцаў на пляцы ў выглядзе раскрытага бутона называецца «кветкай». Дарэчы, гэта чыста беларускі элемент, які ўжо пачалі паўтараць у іншых краінах. Элемент «даміно» таксама можна ўбачыць у многіх дзяржавах. Але ў такім тэмпе, як яго дэманструе наша рота, яго не выконваюць нідзе.

Выступленне роты ўпрыгожваюць салісты-віртуозы. Гэта асобная група салдат, якія выконваюць самыя складаныя элементы.

— Звычайна гэта найбольш спрытныя юнакі, якім з самага пачатку лёгка даецца работа з карабінам, — гаворыць Павел Шпарла. — Іх адразу заўважаеш. Калі новых салдат пачынаем вучыць прыёмам, у кагосьці атрымліваецца хутчэй, а ў кагосьці марудней. Першыя вылучаюцца з агульнага строю, і ім можна ўскладніць задачу. І самыя лепшыя з іх потым становяцца гэтымі чатырма-шасцю салдатамі, якія ўмеюць больш, чым астатнія.

#### Самыя «модныя»

У гардэробе салдата роты — некалькі камплектаў ваеннай формы. Баявая, якая выкарыстоўваецца на трэніроўках і ў паўсядзённай жыццядзейнасці. Выхадная, у якой юнакі ідуць у звальненні. Асабліва парадная летняя, асабліва парадная зімняя — менавіта ў такой вопратцы мы бачым іх падчас выступленняў. Прычым у некаторых ваеннаслужачых роты па два камплекты формы: зялёная, якая сімвалізуе сухапутныя войскі, і сіняя, якая сведчыць аб прыналежнасці да Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны.

Дарэчы, парадныя камплекты вопраткі кожнаму юнаку шыюць індывідуальна ў Доме ваеннага адзення. Тут жа майстры ўручную робяць для іх і хромавыя боты.

— Нам не ставяць на іх ніякіх набоек, бо мы часта працуем на мармуровай паверхні або гладкай плітцы, — развенчвае ўсе міфы Павел Шпарла. — Імі мы можам не толькі падрапаць падлогу, а проста паслізнуцца і ўпасці.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

АДКРЫТЫ ЎРОК
MILITARY STYLE

# Я Ў ЛЁТЧЫКІ ПАЙШОЎ БЫ!

**Сёння мы адправіліся ў Мачулішчы — у 50-ю змешаную авіяцыйную базу. Туды, дзе ў цэнтры ваенна-транспартнай авіяцыі нясуць службу сотні лётчыкаў і авіятэхнікаў. Трапіць сюды — мара кожнага юнака, для якога «першай справай самалёты…»**

Як аказалася, такія мары не толькі ў маладых хлопцаў. Кампанію мінскім школьнікам склалі дырэктар 122-й школы Вераніка Сабіч, яе намеснік па выхаваўчай рабоце Святлана Канапацкая і кіраўнік цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі Савецкага раёна Вітольд Калякоў. Суправаджаць нас па воінскай часці ўзяўся намеснік камандзіра батальёна тэхнічнага забеспячэння па ідэалагічнай рабоце капітан Аляксандр Вернікоўскі. Знаёмцеся, галоўныя героі публікацыі — адзінаццацікласнік сярэдняй школы № 28 Уладзіслаў Лукашонак, які збіраецца паступаць на авіяцыйны факультэт Ваеннай акадэміі, і Яраслаў Скапцоў, вучань 10 класа 122-й школы.

## У самалёце-музеі

Наш адкрыты ўрок пачаўся з наведвання музея. Самалёта-музея — было б дзіўна ўбачыць іншы на тэрыторыі легендарнай авіябазы. Тут, у салоне самалёта «Ан-26», размясцілася экспазіцыя, прысвечаная воінам-інтэрнацыяналістам, якія ваявалі ў Афганістане. Усе яны ў розны час праходзілі службу тут, у 50-м асобным змешаным авіяцыйным палку — менавіта так да 1994 года называлася воінскае падраздзяленне.

— Музей стварылі сваімі рукамі, адкрывалі яго літаральна ўсім светам, — пачаў экскурсію капітан Вернікоўскі. — Рэчы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, прыносілі самі ўдзельнікі вайны ў Афганістане. Як, напрыклад, заслужаны ветэран Узброеных Сіл палкоўнік Рагачоў, які сёння працягвае несці службу на пасадзе намесніка камандзіра авіябазы.

У перыяд вядзення баявых дзеянняў у Афганістане загінулі 132 ваеннаслужачыя палка. За гады ўзброенага канфлікту шэсць афіцэраў часці сталі Героямі Савецкага Саюза. Пра іх лёсы мы даведаліся са стэндаў, як і крыху пра іншых, чые рэчы выглядалі з-пад шкла: ваенная форма тых часоў, карты, галаўныя ўборы…

— Пра тую вайну, на жаль, мы ведаем няшмат, — гаворыць Яраслаў. — У падручніках па гісторыі ёй прысвечана ўсяго некалькі абзацаў. Пра Афганістан ведаю больш са слоў бацькі, сябры якога таксама ўдзельнічалі ў той вайне.

— Праграмай выхаваўчай работы прадугледжана пэўная колькасць мерапрыемстваў, якія дазваляюць знаёміць дзяцей з воінамі-інтэрнацыяналістамі, удзельнічаць ім у штогадовым мітынгу-рэквіеме на Востраве слёз у Мінску, — не пагаджаецца дырэктар 122-й сярэдняй школы. — Магчыма, пэўныя даты і падзеі гэтай вайны ім невядомыя, але тое, што гэта было ў гісторыі нашай краіны і нашых вайскоўцаў, яны добра памятаюць.

Такая ж пазіцыя і ў кіраўніка цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі Вітольда Калякова. «На занятках юнакі вывучаюць гісторыю подзвігаў беларусаў і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і ў мірны час, — пацвярджае афіцэр запасу. — Моладзь павінна ведаць, з чаго ўсё пачалося, чаму нашы суайчыннікі выконвалі інтэрнацыянальны абавязак і чаму гэта была ўсё-такі наша вайна».

Поўныя ўражанняў, выходзім з самалёта-музея. Накіроўваемся ў казарму, дзе жывуць салдаты тэрміновай службы. Пакуль ідзём, Уладзіслаў расказвае, што любоў да авіяцыі ў яго з дзяцінства. Найлепшымі цацкамі заўсёды былі верталёцікі і самалёцікі, а ўлюбёнымі фільмамі — вядома, пра авіяцыю.

## У госці да салдата

Паглядзець, як жывуць вайскоўцы тэрміновай службы, вырашылі невыпадкова. Калі юнакі паступяць у Ваенную акадэмію, іх таксама чакае казарменнае становішча. Калі ёсць такая магчымасць, то чаму б не пазнаёміцца з ім загадзя?

— Тут парадак лепшы, чым у мяне ў кватэры, — сказаў як адрэзаў Яраслаў.

Сапраўды, акуратна засланыя ложкі, чысціня і ўтульнасць памяшкання не маглі не ўразіць. «Мне даводзілася жыць у падобным месцы, — перарывае цішыню Улад. — Прыкладна два гады таму я са школай ездзіў у ваенны лагер. Было даволі цікава, мне спадабалася. Праўда, цяжкавата будзе прыстасавацца да вайсковай дысцыпліны, асабліва да ранняга пад'ёму і позняга адбою».

Яраслава хвалюе іншае. Нягледзячы на тое, што ён даволі камунікабельны хлопец, заводзіць знаёмствы першым яму складана. Прычым ён часта бывае ў новых і вялікіх калектывах: юнак займаецца сучаснымі танцамі. Аднак усё бывае ў першы раз. «Калі не прайду медыцынскую камісію, то, хутчэй за ўсё, буду паступаць у лінгвістычны ўніверсітэт», — разважае таленавіты хлопец.

— А калі я па стане здароўя не буду падыходзіць для кіравання лётным транспартным сродкам, — перабівае яго Уладзіслаў, — то ўсё роўна стану ваенным: буду тэхнічна абслугоўваць авіяцыю. Нехта ж павінен Радзіму абараняць!

## Лётныя майстар-класы

На такой пазітыўнай ноце мы накіраваліся на аэрадром. Тут у ціхі бязвоблачны дзень бушаваў вецер: сёння якраз былі палёты. Нас сустрэў камандзір верталёта «Мі-8» Вячаслаў Рычкоў, які з задавальненнем пагадзіўся пазнаёміць нас з некаторымі відамі баявой тэхнікі.

Мы на борце транспартна-баявога самалёта «Іл-76». Не ведаю, як усе астатнія, а я такога вялікага самалёта не бачыла ніколі! «Боінг 777» у параўнанні з ім — самалёцік.

— Судна прызначана для пілатавання грузаў, ваеннай тэхнікі, асабовага складу як пасадачным, так і беспасадачным спосабам, — расказвае памочнік начальніка тэхнічнага разліку падрыхтоўкі самалётаў і авіярухаўнікоў «Іл-76» старшы лейтэнант Андрэй Мілашэвіч. — Гэта адзіны самалёт, які дазваляе ажыццяўляць дэсантаванне ў чатыры патокі. У выпадку перавозу асабовага складу ёсць магчымасць усталяваць другі ярус крэслаў, так званую другую палубу. Усяго на борце можна перавезці да 225 чалавек. Максімальная ўзлётная вага — 190 тон. Рухаецца самалёт з сярэдняй хуткасцю 750 кіламетраў у гадзіну.

**Мы ўзляталі і рабілі пасадку, ляцелі зусім нізка над зямлёй і паднімаліся вышэй аблокаў, мянялі курс руху і нават падалі…**

Экіпаж «Іл-76» складаюць камандзір карабля, яго памочнік, старшы борттэхнік, бортрадыст, борттэхнік па авіяцыйна-дэсантным абсталяванні, штурман і бартавы паветраны стралок. Апошнія ў мірны час не лятаюць. Даўжыня грузавой кабіны самалёта — 20 метраў. Каб уявіць, многа гэта ці мала; тут, напрыклад, можна размясціць два аўтамабілі «УАЗ», дзве БМП (баявыя машыны пяхоты) або адзін танк.

— Ці змогуць лётчыкі пасажырскіх самалётаў кіраваць такой махінай? — цікавіцца кіраўнік цэнтра дапрызыўнай падрыхтоўкі.

— Думаю, што перасесці з новага «Боінга» сюды лётчыку будзе складана, — упэўнены авіятар. — Згодна з апошнімі тэндэнцыямі, у сучасных самалётах прадугледжаны кнопкі «ўзлёт» і «пасадка». Ды і экіпаж там — толькі два чалавекі. Больш рэальна, калі ваенны лётчык перасядзе на грамадзянскі «авіялайнер». У мяне, напрыклад, калі прыйшоў сюды са знішчальніка «МіГ-29», таксама вочы разбягаліся ад вялікай колькасці прыбораў. Палохалі і памеры самалёта. Аказалася, што вагу бярэ на сябе гідраўлічная сістэма. Таму, каб падняць такую махіну ў неба, лётчыку асаблівых намаганняў прыкладаць не трэба.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мы ў кабіне верталёта «Мі-8». Юнакі — за штурвалам: адзін на месцы камандзіра экіпажа, другі — на крэсле лётчыка-штурмана. «Калі вы станеце лётчыкамі, вашай першачарговай задачай стане вядзенне верталёта па маршруце, — тлумачыць Вячаслаў Рычкоў. — Таксама патрэбна будзе прыляцець на зададзены пункт на пляцоўцы, выйсці на цэль у зададзены час».

Пакуль хлопцы атрымлівалі свой першы майстар-клас па лётным мастацтве, мы разглядалі самалёты і верталёты, якія адзін за адным узнімаліся ў неба. Назіралі і за тым, як яны рыхтуюцца да палётаў.

— Верталёт бачыў толькі ў дзяцінстве, гадоў пяць мне было, — поўны ўражанняў, крычыць Яраслаў, выходзячы з кабіны верталёта і імкнучыся перабіць гул лопасцяў. — Ён заўсёды здаваўся мне меншым.

— Сапраўды, памеры ўражваюць! — падтрымлівае таварыша Улад. — А колькі там усярэдзіне самых розных прыбораў! На любым з верталётаў хацеў бы палятаць!

## Мы — пілоты… віртуальныя

А пакуль «палятаем» на трэнажоры верталёта «Мі-8», у якім мы толькі што былі. На ім пілоты праходзяць падрыхтоўку перад палётамі. Гэты суперсучасны трэнажор сабраны беларускай кампаніяй па апошнім слове тэхнікі, абсталяваны камп'ютарамі і праектарамі.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

■ Конкурс

# МОЙ АБАВЯЗАК — ВЕДАЦЬ!

**Чым далей ад нас падзеі Вялікай Айчыннай вайны, тым часцей мы павінны гаварыць пра веліч таго подзвігу, які здзейснілі нашы дзяды і прадзеды. Са зброяй у руках яны адстойвалі свабоду нашай краіны, многія з іх загінулі, але здолелі перамагчы і падараваць нам мірнае жыццё. У самае пекла вайны трапіў і мой прадзед — Эдуард Мацвеевіч Патэйка. Я назаўжды запомніў гісторыю, якую расказваў мне мой продак-ветэран.**

«У 1944-м, пасля вызвалення Беларусі, нам прынеслі павесткі — на вайну. У той дзень іх атрымалі некалькі чалавек з нашай вёскі. Ажно тры прыйшлі ў нашу хату… На вайну, акрамя мяне, прызываліся два старэйшыя браты: Станіслаў і Іван.

Вось толькі спазнаць зваротны шлях пашчасціла не ўсім аднавяскоўцам. Навечна застаўся пад Берлінам Юзаф Патэйка, загінуў сусед Францішак Курыла. Але тады, у дарозе, пра гэта не гаварылі. Трымалі фасон: жартавалі, рабілі выгляд, што не страшна.

З Гудагая нас цягніком завезлі ў Маладзечна, далей ішлі пешшу. Усе мы трапілі ў адзін полк Польскай арміі. Мае браты — у першы батальён, я — у другі. Трапіў у пяхоту — царыцу палёў. Лагер разбілі ў лесе, зладзілі там на скорую руку зямлянкі — вось і ўсе казармы. На працягу двух тыдняў нас вучылі страляць, акопвацца, ганялі бягом па лесе — і шагам марш на фронт!

Вайна для нас пачалася з польскага горада Турэк. А баявое хрышчэнне атрымалі пры фарсіраванні ракі Нэйсе. Мы ішлі на горад Згажэлец. А фашыст, як гадзіна, якой наступілі на хвост, джаліў з апошніх сіл. Самалёты, артылерыя, танкі — усё вывяргала агонь, плявалася смерцю. Жудаснае гэта відовішча — неабстраляныя, бязвусыя салдацікі, што брыдуць — вады пад пахі — насустрач суцэльнай сцяне агню. Геройства? Не, нас вяло не геройства, тут іншае. Проста рэальнасць як бы страчвалася. Кожны ведаў адно: ён мусіць дабрацца да процілеглага берага. І ішоў. Пакуль мог. Пакуль быў жывы. А Нэйсе чырванела ад крыві, скакала, як горная рака, па целах забітых байцоў. Бой цягнуўся да вечара. Загінула шмат. Але хто ж тады лічыў гэтыя страты асабістага складу? Была адна задача — наперад!

Я не раз думаў, што дапамагло мне застацца ў жывых? Побач жа гінулі вопытныя байцы, якія ішлі па вайне ўжо некалькі гадоў. Можа, сляпая ўдача? Можа, шкаплерык, які на развітанне кожнаму з нас надзела на шыю маці? Або яе гарачая малітва? І мая малітва таксама… У польскай арміі малітва не забаранялася. Наадварот, у кожны палку быў свой святар.

Якія гарады бралі? Розныя. Хіба іх прыпомніш усе… Тым больш назвы нямецкія, закавырыстыя. Буйныя гарады, безумоўна, не забываюцца. Дрэздэн бралі. Да самага Берліна дайшлі! Немцам ваявалася лацвей — яны адыходзілі на гатовае, усюды іх чакалі папярэдне выкапаныя, акуратныя акопы. Мы ж наступалі, таму павінны былі акапацца ў выпадку патрэбы за лічаныя хвіліны.

Кухня? Як жа, заходзіла. 100 грамаў хлеба, каша, часам — нават суп (бульба з вадой, крыху прыскваранай). Але ў прымаўку: «Вайна — вайной, а кухня — па раскладзе» моцна верыць не раю. Усяляк на вайне прыходзілася. Прынамсі, галадоўка на працягу 2–3 дзён — зусім не рэдкасць.

А ў Рэйхстаг я так і не трапіў. На подступах да Берліна мяне паранілі мінамётным асколкам. Кавалачак металу так і застаўся ў плячы, быццам падарунак ад цёткі Вайны. Я тады месяц праваляўся на бальнічным ложку. Так што вайну закончылі без мяне. Не скажу, што асабліва рваўся ў бой: чым бліжэй канец вайны, тым страшней загінуць. Але пэўная прыкрасць усё ж была. Як гэта фінальную кропку паставяць без мяне?

Хаця канчаткова зразумеў, што вайне канец, яшчэ не скора. Мае браты вярнуліся дадому амаль адразу ж, а мне давялося даслужваць тэрміновую. Так што на бацькоўскі парог я ступіў у самым канцы снежня. Якраз на Каляды. Родныя гатавалі куццю, а тут — я. Сеў разам з усімі за стол, пераламаў аплатку — і толькі тут зразумеў: усё, канец, адваяваў.

І ведаеце, стала чамусьці неяк сумнавата. Так, вайна — гэта жудасна, гэта агонь, бруд, смерць. Але існуе на вайне найвышэйшае мужчынскае братэрства, якога ніколі не сустрэць у мірным жыцці.

…Ажаніўся. Нарадзіліся дзеці. Працаваў брыгадзірам, сталяром. Пабудаваў хату, падняў дзяцей. Усё, як ва ўсіх. Мірнае жыццё аднолькавае ў тысячы людзей. А вайна? Не, яна часам яшчэ вяртаецца да мяне ў снах. Але з кожным годам усё радзей. І дзякуй Богу…»

Вялікая Айчынная вайна… З гэтай душэўнай ранай, з гэтым болем пражыў усё жыццё мой прадзед. Ён быў чалавекам вельмі мудрым, добрым, сардэчным. Але самае галоўнае, для мяне ён быў героем. Застаецца ім і сёння.

**Яўген ТАМАШЭВІЧ,**

*Астравецкі раён*

70 ГОД 1945–2015 Вялікай Перамогі

# ВЯРТАННЕ З НЕБЫЦЦЯ

## Астанкі чырвонаармейца Фёдара Прохарава будуць перапахаваны на яго радзіме

**Масквіч Алег Яршоў цяпер зможа прыехаць на магілу свайго прадзеда Фёдара Прохарава. У Гродне, каля вечнага агню ў парку імя Жылібера астанкі чырвонаармейца з адпаведнай воінскай пашанай перадалі пасольству Расійскай Федэрацыі ў Беларусі для далейшага перапахавання на радзіме байца ў Калужскай вобласці. У гэтай цырымоніі ўдзельнічаў і Алег. Вядучы спецыяліст ваеннага камісарыята Гродзенскай вобласці Аляксандр КАВУН расказаў карэспандэнту «Звязды», як удалося вярнуць з небыцця імя салдата, звестак пра якога не было з пачатку Вялікай Айчыннай вайны.**

— Гэта вынік работ 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна на тэрыторыі ваеннага гарадка Фолюш, дзе гітлераўцы хавалі савецкіх ваеннапалонных 324-га шталага. Калі пасля вызвалення Беларусі стварылі камісію па вызначэнні зверстваў фашызму, то ў Гродне выявілі 68 магіл вязняў гэтага канцлагера. Тады, у 1944 годзе, іх перапахавалі ў раёне вуліцы, якая цяпер носіць імя Вольгі Соламавай (там ёсць помнік палеглым), і здавалася, што на гэтым пошукавая праца закончылася. Аднак з 2006 яна прадоўжылася, бо, аказваецца, былі і яшчэ магілы. Адступаючы, гітлераўцы імкнуліся замесці сляды сваіх злачынстваў: масавыя пахаванні маскіраваліся пад кветнікі, агароды, лесапасадкі. Прычым калі спачатку ў канцлагеры магілы рабіліся невялікія (на 5–10 ахвяр), то пазней капаліся вялізныя ямы, дзе хавалі ў дзясяткі разоў больш памерлых і забітых чырвонаармейцаў. Агульная колькасць загінулых перавышае, верагодна, 18 тысяч чалавек.

Некалькі гадоў таму на тэрыторыі ваеннага гарадка выявілі і перапахавалі ў брацкай магіле астанкі больш як 1300 ваеннапалонных шталага № 324. А летась там эксгумавалі яшчэ каля 1,5 тысячы астанкаў. Пры гэтым, акрамя розных рэчаў (спражкі, гузікі, сцізорыкі) знайшлі 45 салдацкіх медальёнаў з асабістымі звесткамі аб ваеннаслужачых і 2 жэтоны з нумарамі ваеннапалонных, дзякуючы якім устаноўлены асобы 21 загінулага. Сярод іх і чырвонармеец Фёдар Нікіфаравіч Прохараў, 1903 г. н., ураджэнец вёскі Юр'еўскае Малаяраслаўскага раёна Калужскай вобласці. Ён лічыўся зніклым без вестак з верасня 1941 года. Удалося адшукаць сваякоў байца, якія папрасілі перапахаваць яго астанкі на малой радзіме. Што і будзе зроблена.

**— Аднак пошукавая «кропка» на Фолюшы яшчэ не пастаўлена…**

— Шэраг аб'ектаў верагодных масавых пахаванняў законсерваваны да сёлетняга пошукавага сезона, які звычайна пачынаецца напрыканцы красавіка — на пачатку мая і доўжыцца да канца кастрычніка. Работы наперадзе яшчэ шмат. І не толькі на Фолюшы, але і ў іншых мясцінах Гродзеншчыны.

Падкрэслю, што пошук няўлічаных воінскіх пахаванняў тычыцца ахвяр усіх войнаў, якія не абмінулі тэрыторыю Беларусі. Нядаўна, напрыклад, стала вядома пра два пахаванні ў Іўеўскім раёне, якія, верагодна, адносяцца да 1812 года.

**— Куды звяртацца людзям, у якіх ёсць звесткі альбо нейкія версіі аб знаходжанні пахаванняў?**

— Калі маецца такая інфармацыя, то трэба абавязкова звярнуцца ў ваенны камісарыят па месцы жыхарства — у кожным ёсць прадстаўнік, які займаецца ўвекавечаннем памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Гэтыя звесткі становяцца падставай для інфармацыйнага



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Цырымонія перадачы астанкаў чырвонаармейца Фёдара Прохарава для перапахавання на яго радзіме.**

ліста з фота ці схемай пахавання, які ўзгадняецца са старшынёй райвыканкама і накіроўваецца ў Міністэрства абароны, дзе ствараецца план пошукавых работ. І потым на мясцовым узроўні вырашаюць, хто і што павінен зрабіць.

**— Ці заўсёды звесткі аб воінскіх пахаваннях пацвярджаюцца?**

— Зразумела, не заўсёды. Напрыклад, нядаўна праверылі пісьмо адной пажылой жанчыны пра шпіталь, які падчас вайны знаходзіўся непадалёк ад вёскі Путрышкі Гродзенскага раёна. Там адбываліся аперацыі (нават драўляны будынак захаваўся), хавалі памерлых. Жанчына ўпэўнена паказала гэтае месца, дзе ёй у дзяцінстве забаранялася бегаць, крычаць. Аднак, усё перакапаўшы на гэтым участку, ваеннаслужачыя 52-га батальёна нічога не знайшлі. Чаму? Магчыма, неўзабаве пасля прыходу савецкіх войскаў гэтыя астанкі эксгумавалі і перапахавалі — верагодна, у Путрышках каля помніка загінулым. Бо калі побач гэтая вёска, навошта было везці на перапахаванне ў Гродна?

Але ў большасці выпадкаў, калі прымаецца рашэнне аб пошукавых работах, звесткі пацвярджаюцца. Летась, у прыватнасці, выявілі пахаванне часоў Першай сусветнай вайны ў Смаргоні. А на Слонімшчыне 52-м батальёнам, групай «Бацькаўшчына» і маладзёжным пошукавым атрадам з Татарстана знойдзены астанкі каля 70 чырвонаармейцаў, якія загінулі ў 1941 годзе, і асобы чатырох з іх удалося ўстанавіць. Спадзяюся, што сёлета дзякуючы пошукавым работам у Гродне, у Астравецкім, Слонімскім, Смаргонскім, Карэліцкім раёнах з небыцця вернуцца і іншыя імёны.

Дарэчы, звяртаюся з просьбай да чытачоў «Звязды», асабліва з Карэліцкага раёна. У Гродзенскі абласны ваенны камісарыят прыйшоў ліст з Санкт-Пецярбурга ад Уладзіміра Грынёва, які спрабуе даведацца аб месцы пахавання сваяка яго сяброў, байца партызанскага атрада Івана Галавіна, каб увекавечыць яго памяць. Вось што вядома на цяперашні час.

Іван Рыгоравіч Галавін закончыў шафёрскія курсы ў Варонежы. Перад самай вайной прыехаў, верагодна, вольнанаёмным на тагачасную тэрыторыю Заходняй Беларусі ў Сувалкі, дзе працаваў шафёрам на аэрадроме. Потым для Івана — вайна, палон, уцёкі, збіранне на месцах баёў зброі, стварэнне падпольнай групы, якая нападала на фашысцкіх акупантаў.

У сакавіку 1942 года адзін з мясцовых жыхароў выдаў партызанаў, гітлераўцы іх акружылі, і завязаўся бой. Галавін прыкрываў адыход асноўнай групы, але быў паранены і ўзяты ў палон. Фашысты скруцілі яму рукі калючым дротам і павялі ў вёску Мір, дзе пасля двухдзённага катавання павесілі. Паводле ўспамінаў аднаго з баявых таварышаў Івана Рыгоравіча, у 1948 годзе ён пабываў у Міры і размаўляў са многімі мясцовымі жыхарамі, якія бачылі Галавіна ў апошнія хвіліны яго жыцця: «Мне яны казалі, што Іван увесь час маўчаў і нічога не сказаў»…

У раённай кнізе «Памяць» звестак пра Івана Галавіна, аднаго з першых падпольшчыкаў на тэрыторыі Карэліцкага раёна, няма. Але ёсць, напрыклад, інфармацыя, што безыменныя астанкі былі знойдзены каля Мірскага замка і пад № 66–58 перапахаваны ў пасёлку на вайсковых могілках. Можа, гэта астанкі Івана Галавіна? Калі хтосьці з мясцовых жыхароў ведае верагоднае месца яго пахавання, просьба паведаміць у любы орган ваеннага камісарыята ці ў рэдакцыю газеты «Звязда».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# СКАРБОНКА АРМЕЙСКІХ УСПАМІНАЎ

## ДЗЕ ВАЙСКОЎЦЫ ЗАХОЎВАЮЦЬ ПАМЯЦЬ ПРА СЛУЖБУ?

**Шкада, але інфармацыя ў нашай памяці мае адну дрэнную асаблівасць. Яна сціраецца, як файл з флэшкі. І ты пасля доўга-доўга робіш разнастайныя маніпуляцыі, каб аднавіць каштоўныя звесткі. У свой час ваеннаслужачыя перад звальненнем прыдумалі ствараць спецыяльныя альбомы, адметныя скарбонкі ўспамінаў, на старонках якіх хаваецца летапіс сапраўднага армейскага жыцця. І калі ты маеш такі на хатняй палічцы, зусім не варта напружвацца, каб узгадаць патрэбную падзею са службы ў войску. Можна проста адгарнуць першыя старонкі, схаваныя за калькай, і адразу з усмешкай ці без яе паглыбіцца ў тагачаснае жыццё, у чарговы раз задумацца пра тое, як лёс раскідаў па свеце тваіх баявых сяброў... Прызнаюся, напачатку хацелася напісаць адзін артыкул аб армейскіх альбомах, але пасля зразумеў, што гэту тэму можна зрабіць пастаяннай рубрыкай. Даць магчымасць цікавым асобам расказаць пра службу, падзяліцца сваімі гісторыямі, вандруючы па старонках салдацкіх фоталетапісаў. А пачаць хацелася з таго, што паўплывала на маё рашэнне заняцца гэтай тэмай, — з бацькоўскага чырвонага армейскага альбома.**

### Шэсць пальцаў і рускі мядзведзь

— Рабіць падобныя альбомы ў наш час было надта модным, — узгадвае Сяргей Шчыры, які праходзіў воінскую службу ў Ансамблі песні і танца 2-й гвардзейскай танкавай арміі ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. — І я не ведаю тых, хто б не меў такую рэч. Яны звычайна выраблялiся ў апошнім перыядзе службы за некалькі месяцаў да «дзембеля». Асноўную частку альбомаў складалі фотаздымкі, паштоўкі, малюнкі сцэнак з салдацкага жыцця і шаржы. Фота мы рабілі на агульную плёначную фотакамеру, а сам альбом, набыты ў салдацкай краме, аздабляў мастак ансамбля. Мне, напрыклад, на першай старонцы ён намаляваў вялікі скрыпічны ключ і ноты, а астатнія адлюстроўвалі ўсё, што толькі можна. На апошняй старонцы аднаго альбома я ўбачыў карту ГДР, якая чамусьці мяжуе не з Польшчай, а адразу з Саюзам. Удалечыню, на Маскву, бягуць вагоны з «дзембелямі», а каля Германіі сядзіць вялікі рускі мядзведзь і завязвае на вузел рэйкі, маўляў, бывай, ГДР, я больш сюды ніколі не вярнуся.

Але не меншым поспехам карыстаўся роспіс «дзембельскага» чамадана. Ваеннаслужачыя асабліва любілі ляпіць на сваю паклажу пераводныя карцінкі з выявамі нямецкіх прыгажунь, пісаць лацінскімі літарамі DDR і USSR. Акрамя таго перад звальненнем кожны хацеў выглядаць ахайна, прыгожа. Дзеля гэтага многія імкнуліся прыталіць шынель, начасаць яго для пышнасці металічнай шчоткай, набіць абцасы на ботах, павесіць аксельбанты (іх выраблялі са стропаў парашутаў), выгнуць спражку. Нехта нават умудраўся здабыць сабе новую форму. Праўда, калі ваеннаслужачы трапляў на перасыльны пункт, уся прыгажосць, якая каштавала многіх месяцаў працы, вокамгненна здзіралася, ірвалася і знішчалася. Вайсковы статут падобнага не дазваляў.

Дарэчы, нашага мастака стараслужачыя літаральна задзяўблі сваімі мастацкімі просьбамі. Нікога не хвалявала, што часу на гэта няма. Працуй уначы, але ўсё павінна быць зроблена ў патрэбны час. У выніку ён вырашыў прыкінуцца неразумным і намаляваў аднаму «дзеду» ў альбоме шэсць пальцаў. Свайго ён, вядома, дасягнуў, аднак наганяй атрымаў таксама добры.

### Ад Магдэбурга да Ростака

— Я імкнуўся кожны фотаздымак у альбоме суадносіць з прымацаванай паблізу выявай горада, дзе мы выступалі з канцэртамі, — кажа суразмоўца і паказвае старонкі, запоўненыя рэпартажнымі здымкамі і выразкамі з паштовак. — Мы былі адзінай часцю, якая для нашай арміі платнымі выступленнямі рэальна зарабляла грошы. Выступалі — паўсюль. У салдацкіх клубах, на палігонах перад ваеннаслужачымі Групы Савецкіх войск у Германіі, перад нямецкімі гледачамі, напрыклад, са знакамітым балетам з берлінскага Фрыдрыхштадтпаласта, які шмат паказвалі па тэлебачанні. Нават гралі ў Ростаку на свяце газеты «Ostsee-Zeitung». Менавіта тады я ўпершыню пачуў «Берлюк» і «Карат», вядомыя рок-гурты з Усходняй Германіі.

Да савецкіх ваеннаслужачых у ГДР ставіліся па-рознаму. Многія сваімі дзеяннямі дыскрэдытавалі вайскоўцаў у вачах тутэйшых жыхароў. Аднак было сярод мясцовых і шмат камуністаў. Мы аднойчы выступалі ў ростацкім



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

параходстве. Перад канцэртам наш начальнік правёў з намі дэталёвую ідэалагічную размову, казаў, што кожны павінен захоўваць гонар савецкага салдата і ніякага спіртнога не ўжываць. А нам, хлопцам, якія трапілі сюды служыць, надта карцела пакаштаваць сапраўднага нямецкага піва. Але пасля такога маналогу ўся надзея знікла. Аднак на банкеце слова ўзяў боцман, форму якога ўпрыгожвалі савецкія ваенныя медалі. Ён вельмі доўга нешта казаў і напрыканцы дадаў самае істотнае: «Я хачу, каб за германа-савецкае сяброўства выпілі і салдаты!» Праз хвіліну з'явіліся афіцыянткі з падносамі, на якіх у кілішках калыхаўся шнапс. Пілі, усміхаліся і ўзгадвалі павучанне нашага кіраўніка ансамбля.

А вось іншым разам здарыўся яшчэ адзін цікавы інцыдэнт. Мы неяк выступалі ў нямецкім санаторыі, і падчас выканання песні пра Сталінград з месца ўзняўся стары з кіёчкам, які, напэўна, падчас вайны апынуўся ў палоне на ўзбярэжжы Волгі.

Мы таксама глядзелі ўпотай тэлебачанне Заходняй Германіі. Дзякуючы гэтаму разумелі, што савецкія вайскоўцы ў Афганістане сапраўды ваююць і сярод нашых суайчыннікаў ёсць палонныя, загінулыя. Пра гэта праграма «Время» нам не расказвала. Але што казаць пра далёкі Афганістан, калі перад нашымі казармамі некалькі тыдняў у баявой гатоўнасці стаялі калоны бранятэхнікі, якія чакалі заказу ісці на Польшчу, дзе набіраў папулярнасць прафсаюз «Салідарнасць», выбухнулі антыкамуністычныя пратэсты. На шчасце, у той момант палітыкі прынялі правільнае рашэнне і тэхніка ў бок Польшчы не рушыла.

Дарэчы, з Савецкага Саюза да нас часта прыязджалі выступаць вядомыя эстрадныя выканаўцы. Так я пачуў ужо добра вядомага Іосіфа Кабзона і яшчэ мала знаёмую Надзею Бабкіну. Пры гэтым спецыяльная дошка ў ленінскім пакоі ўсім паведамляла, што «ў нашым ансамблі пачынаў свой творчы шлях Леў Валяр'янавіч Лешчанка, заслужаны артыст РСФСР».

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# КАНЦЭРТ НА ПЛЯЦЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

— А каб пры інтэнсіўных трэніроўках не зношваліся баявыя боты, у прыватнасці, не сціралася падэшва, што часта бывае, у нас ёсць свае сакрэты, — гаворыць Дзмітрый Хявук і паказвае прымацаваныя да абцасаў «падковы».

Перад кожным выездам у вайскоўцаў ёсць час, каб падрыхтаваць форму. «Пачынаючы ад шкарпэтак і заканчваючы фуражкай, — удакладняе Дзмітрый. — Боты павінны блішчэць, а стрэлкі на штанах трэба так адпрасаваць, каб аб іх можна было палец парэзаць».

І ўсё гэта юнакі робяць самі. Некаторыя да арміі не ўмелі нават гузік прышыць. «Хоць у размяшчэнні ёсць пральныя машыны, я ўсё роўна мыю бялізну ўручную, каб быць упэўненым у яе чысціні», — працягвае малодшы сяржант. Адным словам, форму даглядаюць, як малое дзіця. Праўда, пасля звальнення вайскоўцы з ёй мусяць развітацца. Вопратку, у тым ліку парадную, на рукі не выдаюць: яна трапляе пад утылізацыю.

Увогуле знешні выгляд вайскоўцаў роты ганаровай варты заўсёды павінен быць на найвышэйшым узроўні. Голяцца яны кожны дзень, а падстрыгаюцца прыкладна раз на месяц. Ва ўсіх — модныя стрыжкі, не падобныя адна на адну. У гэтым заслуга саслужыўца, цырульніка па адукацыі. За бездакорны знешні выгляд іх, дарэчы, пачалі называць самым «модным» падраздзяленнем беларускай арміі.



**І ў мароз, і ў спякоту — юнакі на пляцы!**

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

### Служба на перспектыву

У вольны час вайскоўцы з роты ганаровай варты займаюцца ў спартыўнай зале, якая размяшчаецца на тэрыторыі часці. Рэгулярна для іх арганізоўваюцца экскурсіі, паходы ў тэатр і кіно, выязныя мерапрыемствы.

— У якім яшчэ воінскім падраздзяленні ёсць магчымасць з'ездзіць за мяжу? — у адзін голас пытаюць хлопцы і тут жа дадаюць: — Нават у Беларусі не ўсюды былі, а падчас службы аб'ехалі амаль усю краіну!

Калі мы гасцявалі ў роце ганаровай варты, юнакі рыхтаваліся да пляц-канцэрта, які, відаць, ужо прадставілі на адкрыцці міжнароднай выстаўкі ўзбраення IDEX-2015, што цяпер праходзіць у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Яшчэ перад паездкай яны казалі, што, каб не армія, наўрад ці там пабывалі б.

У маі Аляксея Лукановіча і Дзмітрыя Хевука зноў чакае грамадзянскае жыццё. Аднак не сказаць, каб хлопцы былі гэтаму рады. Вельмі палюбілі яны сваю службу. Хоць і перспектывы пасля яе ў іх вельмі добрыя: перавагі пры паступленні ў Ваенную акадэмію і на вайсковыя факультэты іншых ВНУ краіны, добрыя прапановы па працаўладкаванні. Дзмітрый, напрыклад, плануе звязаць сваё жыццё з сілавымі структурамі, куды пасля такой службы яму адкрыты ўсе дарогі.

Напрыканцы вывучаю граматы, дыпломы, іншыя ўзнагароды, якія ў розны час былі прысуджаны роце ганаровай варты. Значная частка з іх — асабіста камандзіру. Пытаюся ў Паўла, якая для яго самая каштоўная.

— Самая лепшая ўзнагарода для нас усіх — грамадскае прызнанне, — перакананы капітан.

А яно ў іх ёсць. Мы заўсёды з нецярпеннем чакаем іх выступленняў і кожны раз, гледзячы на гэтых прыгожых хлопцаў, заміраем з пачуццём гонару за нашу краіну, за беларускую армію.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Я Ў ЛЁТЧЫКІ ПАЙШОЎ БЫ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

— Працуе ён па наступнай схеме, — уводзіць у курс справы начальнік комплекснага трэнажора маёр Сяргей Падуздзікаў. — Існуе матэматычная мадэль палётаў, якая закладваецца ў камп'ютарную базу. Тэхніка гэтую матэматычную мадэль апрацоўвае і выдае параметры, якія ідэнтыфікуюцца на прыборах, што адлюстраваны ў выглядзе дысплеяў. Сюды ж трапляюць сігналы з ручак кіравання трэнажорам, усе гэтыя даныя апрацоўваюцца, і атрымліваецца сам палёт. Дадаткова прадугледжваюцца ўмовы дрэннай бачнасці, начны рэжым палёту. Эфект прысутнасці ствараецца за кошт выявы. За палётам назірае інструктар, пасля чаго робіць высновы, наколькі дакладна выкананыя тыя або іншыя задачы віртуальнага пілота.

На месца асноўнага пілота сеў наш суправаджальнік — камандзір верталёта Вячаслаў Рычкоў. Штурвал другога лётчыка экіпажа пераходзіў ад Уладзіслава да Яраслава і наадварот. Праз некалькі хвілін будучых лётчыкаў адтуль было не выцягнуць. Як пасля і мяне. Лепш за любую камп'ютарную гульню трэнажор акунуў у віртуальны свет, вельмі набліжаны да рэальнасці, дзе я была памочнікам камандзіра экіпажа. Мы ўзляталі і рабілі пасадку, ляцелі зусім нізка над зямлёй і паднімаліся вышэй аблокаў, мянялі курс руху і нават падалі… Але выжылі: у гэтым перавага віртуальнага свету.

«Налятаўшыся», усе моцна захацелі есці. І хуценька накіраваліся ў сталоўку. Вайсковае «служба службай, а абед па раскладзе» ўзяло сваё. На лётны паёк мы не прэтэндавалі, але і афіцэрскае меню прыйшлося нам даспадобы: салата са свежай капусты, расольнік або юшка, дранікі з мясам або бульба з катлетай на выбар. Сок, кісель — і мы гатовыя да палётаў! Толькі ўжо да рэальных, дзе мы — пасажыры.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### У небе над Міншчынай

Мы зноў у верталёце «Мі-8». Камандзір эскадрыллі, лётчык 1-га класа палкоўнік Аляксандр Каралёў знаёміць нас з правіламі бяспекі і паводзін на борце, расказвае пра асаблівасці будучага палёту. Сёння ён за запасным штурвалам, бо кіраваць верталётам будзе камандзір атрада, лётчык 2-га класа Дзяніс Панамарэнка.

Дзверы зачынены. Лопасці разганяюцца ўсё хутчэй. У салоне шумна і вельмі горача. Мы ўзлятаем! Пад намі адзін за адным змяняюцца населеныя пункты: Мачулішчы, Мінск, Фаніпаль, Дзяржынск… Праз акно добра відаць палеткі, дамы, лясы, рэкі — мы на вышыні 900 метраў. З хуткасцю 250 кіламетраў у гадзіну верталёт паварочвае назад. І, нарэшце, доўгачаканая для мяне пасадка (заўсёды хвалююся, калі знаходжуся ў небе).

А хлопцам і 40 хвілін паказалася мала! Застаецца толькі верыць у тое, што Уладзіслаў і Яраслаў паспяхова пройдуць медыцынскую камісію і добра здадуць іспыты. І, магчыма, праз некалькі гадоў у неба падымуць нас яны…

**Вераніка КАНЮТА.**

■ З рэдакцыйнай пошты

# ЯК ПІЯНЕРЫ ВЁСКУ ВЫЗВАЛЯЛІ…

**З набліжэннем да Клімаўшчыны фронту, подых якога з кожным пражытым вераснёўскім днём сорак трэцяга адчуваўся ўсё больш і больш, Клава Капаева ідзе ў вёску Аляксандраўку, што знаходзілася ў партызанскай зоне, да сувязных. У вайну яна — кіраўнік адной з падгруп Клімавіцкага камсамольска-маладзёжнага падполля, а да вайны ўсяго год адпрацавала ў школе настаўніцай.**

Яна хоча даведацца, дзе дакладна ў лесе можна адшукаць партызан, бо тыя апошнім часам часта мянялі сваё месцазнаходжанне. То іх праследвалі франтавыя армейскія часці адступаючага на Захад ворага, то яны самі хаваліся ад яго, то нападалі на невялікія нямецкія падраздзяленні.

Калі ж наведала сувязных і дазналася аб партызанскім лагеры, дзяўчына з добрым настроем, напяваючы, крочыць па лясной сцяжыне ў партызанскі атрад № 45 «За Радзіму». Немцаў яна ніколечкі не баіцца, бо добра размаўляе на іхняй мове, якую ў мірны час выкладала цімнаўскім школьнікам. Спадзеючыся, што неяк выкруціцца. І не з пустымі рукамі ідзе — нясе толькі што сабраныя важныя звесткі пра фашыстаў. З тым разлікам, каб застацца ў лесе і са зброяй у руках змагацца з імі. Так яна цвёрда для сябе вырашыла. Ёй так хочацца, каб узялі ў атрад! Тым больш што ўжо хапіла галаўнога болю-клопату з паліцаем Леанідам Лукашэвічам. Той тады на поўным сур'ёзе пагражаў:

— Гэтую гончую (так ён называў яе за вочы) толькі дзе-небудзь на цёмнай дарозе можна застрэліць. Бо ўсё гойсае сабе туды-сюды: і ў горад, і ў воласць, і да лесу. З незнаёмымі людзьмі сустракаецца. Падазрона ўсё гэта. Пад выглядам таго, што немцам перакладае і ўласаўцы да яе хаты ідуць, яна яшчэ і з хлопцамі з самааховы, лічы, заадно. А гэта ж, як піць даць, падпольшчыкі, якія наўмысна служаць у немцаў!

Немцы ж наўкола ўсё лютавалі, здзекваючыся з мірнага насельніцтва. Людзей, якіх выдавалі здраднікі, арыштоўвалі, дапытвалі, расстрэльвалі, а моладзь — у Германію забіралі. І выйсце было для маладых у гэты суровы час адно — перасядзець дзе-небудзь у надзейным месцы гэтую ваенную завіруху. І за ўсё зручней, зразумела, у самім партызанскім атрадзе. А таму перад самым вызваленнем да лесу падалося нямала людзей. Ішла туды і Клава, ды не адседжвацца, як іншыя, а змагацца, помсціць, ваяваць. Але там мелі зусім іншае меркаванне:

— Трэба, даражэнькая, табе назад у вёску вяртацца. Людзей, ахвотных ваяваць, у нас і так хапае. Вунь, цэлымі пачкамі бягуць. І працягваць, як і раней, падпольную работу, бо ты са сваімі братамі для нас — вочы і вушы. Неабходна дапамагчы наступаючым часцям Чырвонай Арміі ў вызваленні раёна.

Нічога не зробіш — загад ёсць загад! І яна, хаця і са шкадаваннем, але вымушана была вяртацца дадому. Неўзабаве пасля таго Клава даведваецца, што, адступаючы, фашысты пакінулі ўзвод кулямётчыкаў у зрубе, які стаяў каля бальшаку ў яе роднай вёсцы Гірэвічы. А з той пазіцыі быў пад прыцэлам, як на далоні, узлесак, адкуль і павінны былі па ўсёй верагоднасці з'явіцца нашы наступаючыя войскі. Немцы хацелі затрымаць рускіх як мага большы час, пакуль іх асноўныя сілы адыходзілі да вёскі Дарагінь, каб там замацавацца на абарончых рубяжах.

Ранкам 28 верасня 1943 года да хаты Капаевых ледзь не бегма прымчаў сваяк Пракоп Піменавіч Рыжакоз.

— Бачыў, толькі што з лесу выехалі трое вайскоўцаў на конях! — усхвалявана распавёў ён, яшчэ не пераступаючы парога. — Відаць, нашы разведчыкі! Аднаго з іх немцы, мабыць, застрэлілі, бо ўпаў з каня і больш не падняўся, а астатнія — назад паскакалі.

Тэрмінова было неабходна правесці нашых салдат у абход засады. Клава адразу ж кліча Андрушку з Міколкам, сваіх малодшых братоў:

— Хутчэй, хлопчыкі, да сваіх! Паведаміце ім пра фрыцаў, што заселі ў зрубе.

Дзеткі прабеглі нізінай, хаваючыся за кусты хмызняку. Тут ім кожная яліна была да драбніц знаёмая. Яны ж хлопцы мясцовыя! Да вайны, ды падчас яе, тут імі ўсё ходжана і пераходжана. Колькі разоў у тую ж вайну нашых з немцамі гулялі з вясковымі хлапчукамі! Хуценька перапаўзлі праз бальшак з тым разлікам, каб саміх не падстрэлілі фрыцы, і неўзабаве апынуліся ў размяшчэнні воінаў-вызваліцеляў.

Радасцю засвяціліся вочы ў хлопцаў — столькі чырвонаармейцаў! Іх сустрэў афіцэр, старшы лейтэнант Міхаіл Вур'е, бо яны адразу ж запатрабавалі самога камандзіра. Ягоную роту Андрэйка з Міколам, не марнуючы дарэмна час, павялі паміж Гірэвічамі і суседнімі Стайкамі, дзе варожыя стрэлы іх не маглі ўжо дастаць. Але немцы гэтаксама не спалі ў шапку: заўважылі, што іх абыходзяць, ды адзін за адным бягом навыперадкі ў Дарагінь, да сваіх. Частку іх тады перахапілі ў дарозе, узялі ў палон.

Вось так Капаевы-малодшыя дапамаглі вызваліць родную вёску. А разведчыка, забітага немцамі, што былі ў засадзе, старшага лейтэнанта Вікулава ў той жа дзень пахавалі на бальшаку. Там, дзе ён загінуў ад варожай кулі. Побач з яго магілкай пасадзілі бярозку. Расце яна і па сённяшні дзень, нагадваючы гірэеўцам пра воіна-вызваліцеля.

Пасля заканчэння вайны загадам № 33 па батальёне беларускіх арлянат Андрэй Капаеў як піянер, удзельнік Клімавіцкага камсамольска-маладзёжнага падполля быў залічаны ў сімвалічны батальён беларускіх арлянат героя Савецкага Саюза Лівенцава. За свае подзвігі ў тыле ворага ён быў узнагароджаны двума медалямі — «За адвагу» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. », а за мірныя працоўныя будні — медалём «За доблесную працу. З нагоды 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». А ў сувязі са святкаваннем аднаго з юбілеяў Вялікай Перамогі яму ўручылі яшчэ і ордэн — Айчыннай вайны І ступені. Дарэчы, і яго сястра-падпольшчыца Клаўдзія, якая ў той час працавала ў адной са школ Магілёва, атрымала такі ж, толькі ўжо другой ступені.

Заслужана адзначылі абаіх гэтымі высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Ды вось узнагародзіць іхняга малодшага брацікa Міколку, што гэтаксама разам з імі хадзіў на заданні і рызыкаваў сваім жыццём, забыліся. А ён жа як-ніяк таксама арляня Вялікай Айчыннай. Відаць не ўзнагародзілі таму, што быў зусім малы…

**Іван ЛАПО, краязнаўца,**
*г. Клімавічы*

■

■ Вунь яно як...

# Камфорт «чакання» каштуе дорага

## Неўзабаве ўся бытавая тэхніка на рынку Еўразійскага эканамічнага саюза абавязана будзе мець клас энергаэфектыўнасці

**Эканомія — гэта не проста эфемернае паняцце, частка нейкай прапаганды. Гэта рэальная магчымасць для больш багатага жыцця. Асабліва калі размова ідзе пра электраэнергію. Вам можа здацца, што лішняя ўключаная лямпачка ці не выцягнуты з разеткі шнур тэлевізара — гэта лухта, дробязь. А насамрэч у маштабах краіны гэта дае адчувальную эканомію. Тым болей яе дае выкарыстанне сучаснай энергаэфектыўнай тэхнікі. Для распаўсюджвання менавіта такіх прыстасаванняў нашай краіне патрэбна лабараторыя, дзе ўвесь спектр бытавых і прамысловых прылад будзе даследавацца перад допускам на рынак. На наша шчасце, такая лабараторыя ўжо будуецца. Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік выпрабавальнага цэнтра БелДІСС Раман МАРДАШОЎ.**



### МОЖАМ БЫЦЬ ЛЕПШЫМІ

Сёння рэалізуецца праект тэхнічнай дапамогі Еўрасаюза «Падтрымка Рэспублiцы Беларусь у галіне нормаў і стандартаў у сферы энергаэфектыўнасці спажывецкіх тавараў і прамысловай прадукцыі». Згодна з ім на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) запланавана стварэнне лабараторыі па вызначэнні параметраў энергаэфектыўнасці бытавой і прамысловай прадукцыі. Яе функцыянаванне дасць магчымасць айчынным вытворцам істотна скараціць часавыя і фінансавыя затраты пры пацвярджэнні адпаведнасці патрабаванням заканадаўства Еўрапейскага саюза па энергаэфектыўнасці прадукцыі з мэтай паставак яе на рынак Еўрасаюза. Адначасова наяўнасць такой лабараторыі будзе садзейнічаць паступленню на рынак Беларусі і ўсяго ЕАЭС такой жа энергаэфектыўнай прадукцыі.

Зразумела, што стварэнне комплекснай сучаснай лабараторыі па вызначэнні параметраў энергаэфектыўнасці шырокай гамы бытавой і прамысловай прадукцыі немагчымае без ацэнкі вопыту вядучых сусветных лабараторый, якія маюць каласальны досвед працы ў галіне. З гэтай мэтай напрыканцы 2013 года спецыялісты БелДІСС наведалі вядучую ў Германіі арганізацыю ў сферы выпрабаванняў электрычнай і электроннай прадукцыі — інстытут VDE. «Мы думаем, што наша лабараторыя будзе не горшай. Сярод краін СНД мы будзем лепшымі дакладна. Хаця б на момант стварэння. Расія, думаю, падцягнецца праз некаторы час», — удакладняе Раман Мардашоў.

### НАС І ТУТ НЯДРЭННА КОРМЯЦЬ?

Выпрабоўваць будуць электрадухоўкі, кандыцыянеры, светлавое абсталяванне, электрапомпы, халадзільнікі, пральныя і пасудамыйныя машыны, тэлевізары, камп'ютары і іншую офісную тэхніку (адносна энергаспажывання ў рэжыме чакання і выключэння).

Аднак што людзям гэта дасць на практыцы? Як казаў адзін вельмі каларытны персанаж старога мультфільма, нас і тут нядрэнна кормяць, іншымі словамі, і без гэтага неяк жылі. «Адзін і той жа выраб можа быць сканструяваны з большым ці меншым ККД (каэфіцыент карыснага дзеяння. — **Аўт.**). Пры спажыванні аднолькавай колькасці электраэнергіі яны будуць выконваць розны аб'ём работы. А пры аднолькавай выпрацоўцы ў больш энергаэфектыўнага прыстасавання будзе прыярытэт. Для аднаго чалавека гэты эфект можа быць незаўважны, але ў маштабах краіны гэта адчувальна», — лічыць спецыяліст. Таму клас тэхнікі (скажам, A+) мае значэнне, хоць насамрэч ён не скарачае энергаспажыванне ў некалькі разоў — толькі на трошкі: 5, 10, 15 працэнтаў. Аднак усё роўна гэта таксама эканомія. Скажам, пральная машына мае стандартныя праграмы, і ва ўсіх вытворцаў яны прыкладна аднолькавыя. І на выпрабаваннях аналізуюцца суадносіны выдаткаванай электраэнергіі і колькасці вады, якасці мыцця. Несумленны вытворца можа зрабіць праграму, якая будзе спажываць у дзесяць разоў менш энергіі, але нічога не адмые. Улічваецца таксама і ўзровень шуму.

### ХОЧАШ ЦІ НЕ, А ПАВІНЕН

Узнікае і яшчэ адно пытанне: цяпер любая прадукцыя, якая трапляе на наш рынак, будзе праходзіць у гэтай лабараторыі выпрабаванні? «Неабавязкова ў гэтай, — гаворыць Раман Мардашоў. — Але, згодна з праектам тэхнічнага рэгламента «Аб энергетычнай эфектыўнасці электрычных энергаспажываючых прылад», усе будуць правярацца. Бо распрацоўваецца і іншы тэхрэгламент — «Аб інфармаванні спажыўцоў аб энергетычнай эфектыўнасці электрычных энергаспажывальных прылад». Усе падобныя прылады павінны будуць мець маркіроўку энергаэфектыўнасці. Пакуль жа гэта неабавязкова. Таму нехта ставіць, а нехта не. Хтосьці можа ставіць карэктна, а хтосьці, наўмысна ці не, падманваць. Цяпер, пасля выпрабаванняў, нашы вытворцы змогуць пастаўляць сваю прадукцыю адразу і на рынак ЕАЭС, і на рынак Еўрасаюза, бо тэхрэгламенты гарманізаваны з еўрапейскімі стандартамі. Тым больш вытворцы атрымаюць магчымасць яшчэ да серыйнага выпуску прадукцыі правесці выпрабаванні і скарэктаваць свае дзеянні па яе вытворчасці з патрэбнымі характарыстыкамі».



### ВЫКЛЮЧАНА, АЛЕ ПРАЦУЕ

На першым этапе запланавана, што ў лабараторыі будзе працаваць каля 8 чалавек. Потым будзе болей, бо у межах праекта не ўлічана выпрабаванне пыласосаў. Не ўклаліся ў 3,5 млн еўра тэхнічнай дапамогі. «І яшчэ мы пакуль што не будзем выпрабоўваць вентылятары, для чаго патрэбна вельмі дарагое абсталяванне», — дадае Раман Мардашоў. Запуск лабараторыі павінен адбыцца летам. Але пастаўка абсталявання пачнецца вясной і працягвацца будзе да канца года.

Самыя простыя выпрабаванні — гэта выяўленне энергаспажывання ў рэжыме чакання і адключэння. Рэжым — гэта калі тэлевізар выключаны і гарыць толькі маленькі чырвоны індыкатар. Спажыванне энергіі малое (0,5-1 Вт у гадзіну), але розныя прылады ў кожным доме ўключаны пастаянна, і ўявіце сабе, якая гэта страта энергіі. Аднак нават выключаны тэлевізар таксама спажывае энергію. Выключаць трэба з разеткі. І вытворцаў абавязваюць зніжаць спажыванне энергіі прыладамі ў гэтых рэжымах, паколькі выключаць з разеткі таксама нязручна — збіваюцца настройкі і таймеры ■

■ Меркаванне

# АКНО Ў... СНД

**Хочаце незвычайнае параўнанне? Як вы думаеце, на што падобны беларускі арнамент? Зоркі, крыжы, кветкі — што яшчэ? Няхай, усё роўна наўрад ці здагадаецеся. На мікрасхему. Прынамсі, так падалося распрацоўшчыкам эмблемы будучай Генеральнай асамблеі Міжнароднай электратэхнічнай камісіі. Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі, Нацыянальнага камітэта МЭК Рэспублікі Беларусь, Міждзяржаўнага савета па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі краін СНД Віктар НАЗАРАНКА ўпэўнены, што мерапрыемства прынясе Беларусі шмат пераваг і карысці.**



«МЭК — гэта ўвесь свет электрычнасці. І сучасная інжынерная думка, інавацыйнае развіццё, перадавое абсталяванне і тэхналогіі, і міжнародны гандаль, пляцоўка для развіцця моладзі, што выбрала для сябе інжынерную прафесію (сёння, на жаль, не вельмі папулярную), — расказвае Віктар Назаранка. — Але я ўпэўнены, што наша краіна ў міжнародным падзеле працы можа быць годна прадстаўлена айчыннымі інжынернымі кадрамі. І актыўны ўдзел у дзейнасці МЭК, гэтай сур'ёзнай, паважанай міжнароднай арганізацыі, вельмі карысны. Праз гэта можна забяспечваць краіне добрыя магчымасці для развіцця сучаснай прамысловасці. Беларусь увогуле можа стаць «акном» для МЭК на ўсю прастору СНД. Улічваючы тое, што Дзяржстандарт Беларусі ўзначальвае цяпер Міждзяржаўны савет па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, кіраўніцтва МЭК звярнулася да нас з прапановай правесці ў рамках Генасамблеі цэлы шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на пашырэнне ўдзелу краін Садружнасці ў працы гэтай арганізацыі.

Калі ж вы ўважліва паглядзіце на эмблему Генасамблеі, то ўбачыце яе сімвалічнасць. Гэта фрагмент з арнаменту слуцкага пояса. Арнамент стылізаваны пад плату, мікрасхему. А таксама выява падобна на ключ. Гэта і ёсць той самы ключ, ці, калі хочаце, акно, з дапамогай якога многія краіны адкрыюць для сябе Беларусь. І гэты ключ можа ўстаўляцца як з аднаго боку дзвярэй, так і з другога — так і Беларусь адкрые для сябе іншыя краіны як партнёраў. Насамрэч наша ідэя заключаецца ў тым, каб мы ўсе, хто мае сёння сучасныя і прагрэсіўныя ідэі, максімальна эфектыўна змаглі іх выкарыстоўваць у сваёй краіне і, зразумела, у інтэграцыйных аб'яднаннях — ЕАЭС і СНД» ■

■ Фізіка

# АДЗІН НА ЎСІХ

**Маем на ўвазе закон Ома, які, як і астатнія фізічныя законы, у любой краіне дзейнічае аднолькава. Таму Беларусь аддае перавагу прыняццю ідэнтычных міжнародным дзяржаўных стандартаў у галіне электратэхнікі. Часам ідэнтычных еўрапейскім дырэктывам, рэгламентам і стандартам, бо ў плане энергаэфектыўнасці Еўропа з'яўляецца абсалютным лідарам.**



### ВЫРАТУЙ СЯБЕ САМ

«Для нашай краіны энергаэфектыўнасць — неабходная ўмова эканамічнага выжывання. Без змяншэння энергаёмістасці ўсіх галін народнай гаспадаркі нельга чакаць у далейшым канкурэнтаздольнасці і энергетычнай незалежнасці», — сцвярджае **начальнік аддзела тэхнічнага нарміравання і стандартызацыі ў электратэхніцы, радыёэлектроніцы і энергазберажэнні БелДІСС Віктар ЧАЎСАЎ.**

Дапамагчы ва ўкараненні дзейснай сістэмы энергаэфектыўнасці могуць заканадаўчыя патрабаванні (напрыклад, як у Еўрасаюзе) і адпаведная стандартызацыя на падставе дакументаў Міжнароднай электратэхнічнай камісіі, бо яна акумулюе ў сваіх камітэтах вопыт экспертаў і найлепшую практыку вядучых сусветных кампаній. «Мы ў гэтых камітэтах удзельнічаем вельмі слаба. Больш як назіральнікі. Трэба прыцягнуць увагу і забяспечыць удзел айчыннай прамысловасці, — сцвярджае спецыяліст. — Як гэта зрабіць? Пакуль што нашай прамысловасці важна, каб стандарты былі сучасныя — адпаведныя патрабаванням рынку. Ніякага ўплыву на самі міжнародныя стандарты з іх боку амаль няма. Нельга не адзначыць праблему недастатковага фінансавання распрацовак стандартаў. Яны амаль цалкам ідуць за кошт дзяржаўнага бюджэту. Патрэбы прадпрыемстваў павінны сустракаць іх уласную фінансавую падтрымку. Калі арганізацыя лідзіруе, яна зацікаўлена ў тым, каб прыняць стандарт, які будзе адпавядаць яе распрацоўкам. Важна быць першым. Якасць — гэта тое, чым кожны вытворца павінен ратоўваць сябе сам. Бяспеку прадукцыі рэгламентуе дзяржава (цяпер па большай частцы ў межах ЕАЭС). А якасць, ці спажывецкія ўласцівасці прадукцыі, з'яўляецца аб'ектам рынкавай кан'юнктуры — фарміруецца канкурэнтамі, якія змагаюцца за спажыўца».

### ДОБРЫЯ ЎМОВЫ

Што стварае доўгатэрміновыя, пастаянныя ўмовы працы для рынку? Зразумела, агульныя абавязковыя правілы гульні. У электратэхнічнай галіне гэта, напрыклад, тэхнічныя рэгламенты «Аб бяспецы нізкавольтнага абсталявання» (ТР ТС 004/2011) і «Электрамагнітная сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў» (ТР ТС 020/2011), якія ўступілі ў сілу два гады таму. Адзін сертыфікат цяпер дзейнічае на ўвесь Еўразійскі эканамічны саюз. Гэта важна для вытворцаў. Акрамя таго, гэта абарона рынку ад небяспечнай і няякаснай прадукцыі.

**«Якасць з'яўляецца аб'ектам рынкавай кан'юнктуры — фарміруецца канкурэнтамі, якія змагаюцца за спажыўца».**

Але гэтага мала. Уласцівасці энергаэфектыўнасці пакуль нічым не абмежаваны. А тым часам у Еўропе патрабаванні энергаэфектыўнасці ахопліваюць амаль усю бытавую тэхніку і значную частку іншых вырабаў. Напрыклад, бытавыя халадзільныя прыборы і пральныя машыны павінны быць як мінімум класа A+ па энергаэфектыўнасці. Усё, што ніжэй, забаронена. «Наш «Атлант» здольны выконваць гэтыя патрабаванні, і тое добра для яго і для нас усіх. Аднак яго вырабам даводзіцца канкурыраваць з танным імпартам класа A, B і нават C, які прысутнічае на рынку СНД і ЕАЭС. Як вынік, адзіна прымальным варыянтам уяўляецца прыняцце тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС, якія вызначаюць патрабаванні да энергаэфектыўнасці і энергамаркіроўкі. Гэта ўжо робіцца. Падрыхтаваны праекты тэхнічных рэгламентаў «Аб энергетычнай эфектыўнасці электрычных энергаспажывальных прылад» і «Аб інфармаванні спажыўцоў аб энергетычнай эфектыўнасці электрычных энергаспажывальных прылад». Асноўным адрозненнем гэтых праектаў ад комплексу дырэктыў і рэгламентаў Еўрасаюза, якія прынятыя за ўзор, з'яўляюцца тэрміны ўступлення ў сілу значнай часткі патрабаванняў да энергаэфектыўнасці і часовых этапаў узмацнення іх жорсткасці. У гэтай частцы апошняе слова павінны будуць сказаць вытворцы электратэхнічнай прадукцыі дзяржаў — членаў ЕАЭС. У іх інтарэсах актыўна падключыцца да абмеркавання гэтых пытанняў і забяспечыць своечасовую падрыхтоўку вытворчасці да ўвядзення патрабаванняў энергаэфектыўнасці ў абгрунтаваныя тэрміны. У першую чаргу гэта выгадна беларускай прамысловасці», — упэўнены Віктар Чаўсаў ■

■ Праверка

# Высокая ступень гатоўнасці

**Такую ацэнку дала каардынатар Міжнароднай электратэхнічнай камісіі па правядзенні генеральных асамблей Сафі ШАРДОН па выніках сваёй інспекцыйнай паездкі ў Мінск. Эксперт знаходзілася ў беларускай сталіцы на працягу тыдня.**



Праграма візіту была вельмі насычанай. Сафі Шардон наведала гасцінічны комплекс «Вікторыя Алімп Гатэль», Нацыянальны алімпійскі камітэт і шматфункцыянальны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна», дзе ў рамках асамблеі адбудуцца пасяджэнні, форумы і семінары. Яна таксама азнаёмілася з тэхнічнай абсталяванасцю і магчымасцямі канферэнц-зал, нумарным фондам шэрагу гатэляў, у якіх будуць размяшчацца дэлегаты. «Забяспечыць усю гэтую інфраструктуру ў адпаведнасці з патрабаваннямі МЭК, а яны вельмі высокія, з'яўляецца досыць складанай задачай для боку, які прымае, — сказала Сафі Шардон. — Той узровень, які я ўбачыла, дазваляе быць упэўненай, што асамблея ў Мінску пройдзе паспяхова».

З лютага ў рамках візіту адбылася сустрэча Сафі Шардон са старшынёй Дзяржстандарта, старшынёй Нацыянальнага камітэта МЭК Рэспублікі Беларусь Віктарам Назаранкам. Асноўная ўвага была нададзена пераліку тэхнічных камітэтаў МЭК, пасяджэнні якіх пройдуць у рамках 79-й Генеральнай асамблеі. Зараз ён уключае 16 камітэтаў, сфера дзейнасці якіх — стандартызацыя ў галіне электрычнага абсталявання і сістэм для чыгунак, сістэм бесперабойнага харчавання, паўправадніковых прыбораў, аўдыя-, відэа- і мультымедыйных сістэм і абсталявання і іншыя.

Падчас сустрэчы таксама абмяркоўваліся пытанні правядзення форуму для маладых спецыялістаў, арганізацыі тэхнічных візітаў для дэлегатаў ■


Уважаемые акционеры ОАО «Мехколонна №93»

«06» марта 2015 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Мехколонна №93»

расположенного по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13, 1 этаж.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

**1.** О приобретении Обществом акций, эмитированных Обществом.

Орган, созывающий внеочередное общее собрание акционеров, – наблюдательный совет ОАО «Мехколонна №93» на основании Протокола результатов опроса членов наблюдательного совета № 12 от 17.02.2015 г.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, д. 13 (приемная) с «27» февраля по «05» марта 2015 года (время работы с 9.00 до 15.00) либо «06» марта 2015 года по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания **с 09.00 до 10.30** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – **«06» марта 2015 года, 11.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного **на «03» марта 2015 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность. УНП 100003019



В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим ЖЕВНОВА Андрея Олеговича, 10 мая 1982 года рождения, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Набережная, 110/148.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Жевнове Андрее Олеговиче.



**РУП «Белтелеком» (Могилевский филиал) ПЛАНИРУЕТ К ВЫСВОБОЖДЕНИЮ В 2015 ГОДУ ЗДАНИЕ, расположенное по адресу: Могилевская область, г. Могилев, ул. Турова, д. 1-2, общей площадью 3 650,3 кв,м**



Здание представляет собой 4-этажное строение, расположенное в спальном районе города Могилева, имеет хорошие подъездные пути. К зданию подведено центральное отопление, водопровод и канализация. Электроснабжение здания осуществляется по 1 категории (два независимых луча электроснабжения). Здание оборудовано приточно-вытяжной вентиляцией и лифтом.

Высвобожденное здание РУП «Белтелеком» возможно вовлечь в хозяйственный оборот в соответствии с нормами законодательства Республики Беларусь путем сдачи в аренду (проведение аукциона на право заключения договора аренды), безвозмездной передачи (в коммунальную собственность административно- территориальной единицы, либо юридическому лицу без перехода права республиканской собственности), продажи на аукционных торгах.

**Справочную информацию по формам вовлечения в хозяйственный оборот недвижимогоимого имущества можно получить в Могилевском филиале РУП «Белтелеком» по телефонам: 8-0222 29-21-33, 8-0222 29-21-34, 8-0222 29-22-12.** УНП 700838273


# ПАПРАВІМ «ЗДАРОЎЕ» ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЮ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— І як вы ацэньваеце наша «здароўе»?**

— Калі браць «сярэднюю тэмпературу па бальніцы», то яна недзе на троечку з плюсам. Калі браць асобныя «аддзяленні», то ёсць тыя, дзе ўсё проста выдатна, а ёсць, дзе на двоечку. Але якраз і мэта гэтага мерапрыемства ў тым, каб «двоечкі» падцягнуліся да «чацвёрак» і «пяцёрак». Таму важна разумець, што мерапрыемствы такога ўзроўню не праводзяць у нейкіх незразумелых месцах і краінах. Гэта альбо краіны з развітай эканомікай, лідары (летась была Японія), альбо краіны, якія маюць перспектывы для развіцця (напрыклад, Бразілія, ПАР, Ізраіль і, вядома, Беларусь). Беларусь першая з усіх постсацыялістычных краін выбрана МЭК для правядзення Генеральнай асамблеі. Мы гэты шанц павінны выкарыстаць на ўсе сто — пачынаючы з моладзі і заканчваючы інвестыцыямі.

**— А прамысловасць да гэтага гатова?**

— Нашы прамыслоўцы пакуль не разумеюць, што стандарты, дзе зацвярджаюцца патрабаванні да іх прадукцыі, ніхто не павінен прыносіць на талерачцы. Вытворцы павінны быць самі актыўнымі ўдзельнікамі і распрацоўшчыкамі гэтых стандартаў, бо яны, па сутнасці, фарміруюць патрабаванні для сваёй прадукцыі, каб аператыўна распрацоўваць адпаведныя тэхналогіі. Вельмі важна, каб органы дзяржкіравання таксама разумелі сваю ролю ў гэтым працэсе. Патрэбны матывацыйныя, кіраўніцкія механізмы для стымулявання развіцця, а не проста заклікі: «Давайце мадэрнізавацы!..»

**— Ці былі ўжо нейкія дамоўленасці наконт развіцця ў такім кірунку?**

— Для гэтага ніякіх дамоўленасцяў не трэба. Неабходна толькі быць членам МЭК, але не фармальным, а актыўным. Тым больш што краіна штогод плаціць за ўдзел у МЭК долю ад ВУП. Трэба, каб Нацыянальны камітэт МЭК фарміраваўся з найлепшых інжынераў, якія б ужо на стадыі распрацоўкі міжнародных стандартаў прымалі ўдзел у працы тэхнічных камітэтаў.

**— І што для гэтага трэба?**

— Каб у краіне працавалі больш эфектыўна тэхнічныя камітэты, у якія ў асноўным павінны ўваходзіць прадстаўнікі прамысловасці. Карацей, усёй прамысловасці трэба прачнуцца і варушыцца.

**— Якое ў вас уражанне ад апошняй Генасамблеі МЭК, якая прайшла летась у Японіі?**

— У цэлым добрае. На ёй было каля трох тысяч дэлегатаў. Японцы зрабілі так, што ўсе мясцовыя інжынеры без абмежаванняў удзельнічалі ва ўсіх магчымых мерапрыемствах. Але пры ўсім гэтым у нас ёсць патэнцыял да паляпшэння. У многім дзякуючы нашым нацыянальным традыцыям і менталітэту. Бо японцы маюць іншае адчуванне прасторы. Для дзвюх тысяч чалавек яны выбралі вельмі малое памяшканне. І, на мой погляд, плошчы было недастаткова, паколькі на такіх мерапрыемствах, як адкрыццё і закрыццё, людзі пастаянна знаходзяцца ў руху, гутараць, дамаўляюцца. Простых размоў там не бывае. Для гэтага неабходна прастора.

**— Якой тэме быў прысвечаны форум?**

— Па першае, гэта разумныя сістэмы. Нам нават прадэманстравалі жылы квартал, у якім жыве больш за 20 тысяч чалавек, дзе за кошт разумных сістэм кіруецца ўся інжынерная інфраструктура — ацяпленне, святло, вода- і электразабеспячэнне. Калі вы будзеце глядзець збоку, то нават не заўважыце нечага незвычайнага. Але калі пачняце там жыць, то адразу адчуеце, што найбольш эфектыўна выкарыстоўваюцца ўсе энергарэсурсы. Асаблівасцю форуму стала і тое, што ў статут МЭК былі ўнесены змены адносна ўдасканалення сістэмы ацэнкі адпаведнасці, або сертыфікацыі. Было прынята рашэнне, што цяпер у Савет па ацэнцы адпаведнасці пастаянна будуць уваходзіць прадстаўнікі шасці першых краін з самым высокім ВУП, астатнія дзевяць ужо адбіраюцца па прафесійнай прыкмеце. Уведзена катэгорыя «бессмяротных». Гэта выклікала вельмі сур'ёзную дыскусію. Але рашэнне прынята.

**«Было прынята рашэнне, што цяпер у Савет па ацэнцы адпаведнасці пастаянна будуць уваходзіць прадстаўнікі шасці першых краін з самым высокім ВУП. Уведзена катэгорыя «бессмяротных».**

**— Якіх ад гэтага чакаць наступстваў?**

— Будуць адбывацца нейкія сур'ёзныя змены па працэдурах сертыфікацыі, а значыць будзе больш жорсткім допуск на рынак.

**— Ці можна лічыць, што самыя магутныя вытворцы стараюцца зрабіць так, каб іх канкурэнты ўвогуле зніклі?**

— Вы маеце рацыю, але толькі часткова. Я да гэтага стаўлюся наступным чынам. Возьмем мабільны тэлефон. Ёсць дзве катэгорыі вытворцаў — звычайныя і сусветныя лідары, якія шмат укладваюць у развіццё сваіх прадуктаў. Дзякуючы гэтаму мы маем абсалютна надзейную прыладу, бо распрацоўваюцца новыя матэрыялы, канструкцыі. Іншыя робяць тое ж самае «на каленях». А потым абедзве прылады ляжаць у нашых крамах побач. Таму ніхто нікога душыць не збіраецца. Калі ласка, выконвай патрабаванні і працуй.

**«Усёй прамысловасці трэба прачнуцца і варушыцца».**

**— А на чым сфакусіруецца асамблея ў Мінску?**

— Самы галоўны стрыжань — энергаэфектыўнасць. Магчыма, будуць яшчэ дадатковыя тэмы. Гэта не так важна. Мы ствараем умовы. А рэалізоўваць праекты павінны ініцыятыўныя людзі, якія непасрэдна сёння працуюць у прамысловасці. Нам бы толькі іх знайсці. Два тыдні амаль 20 тэхнічных камітэтаў будуць працаваць над сваімі дакументамі. Гэта будзе час вельмі напружанай працы. Плануецца каля 1,5 тысячы ўдзельнікаў.

**— Чым МЭК цікавы для моладзі?**

— Арганізацыя штогод прапануе спецыяльную праграму для маладых спецыялістаў. Адбіраюць каля сотні хлопцаў і дзяўчат. І наша моладзь туды таксама зможа трапіць. Мы зробім для гэтага ўсё магчымае. Гэта вельмі добрая школа. Для ўдзелу неабходна зрабіць заяўку ў сакратарыят Нацыянальнага камітэта МЭК. Але трэба быць спецыялістам у адпаведнай сферы. Абавязковае, зразумела, веданне англійскай мовы. Навучанне будзе праходзіць з элементамі дзелавой гульні. Маладыя спецыялісты атрымліваюць магчымасць набыцця асабістых кантактаў. Пасля гэтага можна трапіць і ў праграму навучання ў Жэневе, апынуцца ў тэхнічных камітэтах. Для ініцыятыўнай моладзі перспектыў вельмі шмат.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

Краіна здароўя
Выпуск № 3 (333)

■ Высокія тэхналогіі

# УБАЧЫЦЬ ФАРБЫ ЖЫЦЦЯ

## За апошнія пяць-сем гадоў наша афтальмалогія наблізілася па ўзроўні тэхнічнага аснашчэння да еўрапейскага стандарту

**Самыя сучасныя метады абследавання даступныя ва ўсіх абласцях. У 2-3 разы вырасла колькасць функцыянальных і ўльтрагукавых даследаванняў. Выконваецца ўвесь спектр хірургічных умяшанняў. Пры гэтым захоўваецца магчымасць атрымання высокатэхналагічнай дапамогі на бясплатнай аснове.**

Колькасць хірургічных умяшанняў у афтальмалогіі вырасла цягам пяці гадоў з 27-мі да 80 тысяч. Толькі лазернай хірургіяй (у стацыянарах і амбулаторна) скарысталіся каля 30 тысяч пацыентаў. Летась было праведзена 1865 высокатэхналагічных аперацый. Колькасць трансплантацый рагавіцы і амніятычнай мембраны вырасла з 34 у 2010-м да 601 летась. Варта мець на ўвазе, што Міністэрства аховы здароўя хоць і кантралюе дзейнасць камерцыйных медустаноў, у тым ліку афтальмалагічнага профілю, аднак у статыстыку вынікі іх работы не трапляюць.

— Колькасць лазерных аперацый расце, паколькі ўжо ўсе афтальмалагічныя аддзяленні аснашчаны лазернымі ўстаноўкамі,— тлумачыць **доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчыца кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны пазаштатны афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Таццяна ІМШАНЕЦКАЯ.** — У рэгіёнах сёння даступныя практычна ўсе сучасныя метады дыягностыкі — аптычнай кагерэнтнай тамаграфіі сярэдняга і задняга адрэзка, статычнай камп'ютарнай тамаграфіі, флюарэсцэнтнай ангіяграфіі, электрафізіялагічных даследаванняў, ультрагукавой біямікраскапіі.

Чатыры гады таму на базе 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска адкрыўся Рэспубліканскі афтальмалагічны цэнтр. Яго аснашчэнне лазерным эксімерным фемтасекундным комплексам значна пашырыла спектр лазерных мікрахірургічных аперацый, дазволіла выканаць 926 карэкцый анамалій і 65 трансплантацый рагавіцы. Анкалагічная профільная дапамога аказваецца ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава.



Самыя распаўсюджаныя аперацыі — па лячэнні катаракты. Выконваюцца яны, дарэчы, шляхам малых разрэзаў, лазерным метадам. Дзякуючы паляпшэнню дыягностыкі, больш выяўляецца хворых з глаўкомай, якія таксама атрымліваюць сучаснае хірургічнае лячэнне (з выкарыстаннем амніятычнай мембраны, дрэнажных і клапанных прыстасаванняў). Асноўныя лекавыя сродкі для лячэння глаўкомы пацыенты атрымліваюць бясплатна.

Праблемы дзіцячага зроку часта звязаны з тым наваколлем, у якім растуць дзеці, а таму вельмі важна прывіваць з самых ранніх гадоў навыкі здаровага ладу жыцця. Тут і гігіена зроку, і заняткі спортам, і правільная арганізацыя вучэбнага працэсу. Амбулаторная дапамога малым пацыентам аказваецца не толькі ў дзіцячых кабінетах, але і, напрыклад, у двух дзіцячых спецыялізаваных санаторыях, скіраваных адначасова і на лячэнне, і на прафілактычнае аздараўленне. Для лепшай адаптацыі дзяцей з аслабленым зрокам дзейнічаюць спецыялізаваныя дзіцячыя садкі, групы.

Найбольшая колькасць вочных захворванняў узнікае, як вядома, у сувязі з пачаткам наведвання дзецьмі школы. Анамаліі зроку выяўляюцца прыкладна ў палովы школьнікаў, пачынаючы з 7 гадоў. Назіраецца тэндэнцыя росту хворых з міяпіяй.

Дыягностыка і лячэнне дзяцей, пачынаючы ад нараджэння, наладжана на самым высокім узроўні, у кожнай вобласці ёсць магчымасць правядзення ранняга лазернага ўмяшання — гэта скарачае колькасць выпадкаў слепаты. Кансультацыйная і лячэбная дапамога маленькім пацыентам са складанай паталогіяй аказваецца ў РНПЦ «Маці і дзіця», Гарадскім дзіцячым афтальмалагічным цэнтры на базе 4-й дзіцячай гарадской бальніцы г. Мінска.

— У нас аказваецца практычна ўся неабходная медыцынская дапамога,— адзначае **доктар медыцынскіх навук, прафесар кафедры афтальмалогіі БелМАПА, галоўны пазаштатны дзіцячы афтальмолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Вікторыя КРАСІЛЬНІКАВА.** — За апошнія два гады не было выпадкаў накіравання пацыентаў за мяжу. Аднак мы не можам забараніць бацькам лячыць дзяцей там, дзе яны жадаюць. Гэта іх асабістае меркаванне, што ў нас нельга атрымаць належную дапамогу. Бывае так, што першую аперацыю бацькам удаецца правесці недзе ў замежжы, а другую — напрыклад, на другім воку — у нашай клініцы, і нашы вынікі лячэння бываюць нават лепшымі за замежныя.

**Самыя распаўсюджаныя аперацыі — па лячэнні катаракты. Выконваюцца яны, дарэчы, шляхам малых разрэзаў, лазерным метадам.**

### Ёсць пытанне

***«У інтэрнэце для работы за камп'ютарам прапануюць спецыяльныя ахоўныя акуляры. Ці варта іх набываць?»***

*Па-першае, акуляры неабходна набываць толькі ў спецыялізаваных пунктах. У інтэрнэт-магазінах у лепшым выпадку можна набыць сонцаахоўныя акуляры. Любы тавар павінен мець сертыфікат, які пераканае нас у яго бяспецы. Спецыяльныя фільтры, якія нібыта абараняюць ад выпраменьвання падчас работы за камп'ютарам, існуюць. Аднак, на жаль, не існуе адпаведнай доказнай базы аб іх эфектыўнасці. Гэта, хутчэй, пытанне веры для пацыентаў: верыш — купляй.*

*Самае важнае ў рабоце за камп'ютарам — вытрымліваць час працы, рабіць перапынкі. Нельга па паўдня без адрыву праводзіць за камп'ютарам. Паўгода такой інтэнсіўнай нагрузкі — і вам спачатку будзе гарантаваны спазм акамадацыі, пасля міяпія слабай ступені, якая пяройдзе праз нейкі час у сярэднюю, а затым і высокую. А скончыцца можа ўсё нават інваліднасцю па зроку.*

*Другі важны момант — выява павінна быць дакладнай, кантраснай, з пэўнай частатой выпраменьвання. Экран не павінен мільгацець. Частата — такая, каб вока яе не заўважала. Зрабіце фотаздымак экрана і паглядзіце, як ён сябе «паводзіць». Найбольш бяспечныя — вадкакрышталічныя экраны.*

■ На талерцы

# СТРАСЦІ ПА ЛІСТКУ САЛАТЫ

## ШТО МОЖА АЗНАЧАЦЬ ФАНАТЫЧНАЕ АДМАЎЛЕННЕ ГАМБУРГЕРА?

**Спіс расстройстваў харчовых паводзін папоўніўся яшчэ адным. Цяпер, акрамя булііміі (прыступы голаду, якія прыводзяць да пераядання і пачуцця віны) і анарэксіі (адмаўленне ад ежы для зніжэння вагі), у чалавецтва ёсць <u>артарэксія — назойлівае выкананне прынцыпаў здаровага харчавання.</u> Урач, які ўпершыню выкарыстаў гэты тэрмін, прызнаў сябе першым афіцыйным хворым. Амерыканскі спецыяліст — вядучы кансультант па артарэксіі Стывен Брэтман — не лічыць расстройствамі харчовых паводзін тое ж вегетарыянства; яго турбуе, калі людзі пачынаюць празмерна фіксаваць сваю ўвагу на падобных сістэмах.**

Такім чынам, артарэксія — гэта неўроз, сістэма звышкаштоўных ідэй з прыкметамі фанатызму і ўцёкамі ад рэальных праблем. Фанатык перакананы, што яго прынцыпы здаровага харчавання — самыя правільныя. Артарэксік верыць, што ідэалы харчавання яго ратуюць, а кожны, хто харчуецца ў «Макдональдсе», памрэ. Гэта чалавек, які будзе за агульным сталом расказваць, як нельга змешваць прадукты, якія вы паклалі сабе на талерку, як і што пачне «брадзіць» у такім спалучэнні ў вашым жываце. Калі вы паспрабуеце што-небудзь сказаць у адказ, вас чакае досыць агрэсіўная рэакцыя. А як жа інакш — іншай думкі не існуе!

Дарэчы, бізнес ужо вучыцца выкарыстоўваць ідэалогію здаровага харчавання для атрымання звышпрыбытку. У нашай краіне гэта пакуль не так актуальна, аднак у свеце з'яўляюцца нечаканыя прапановы далучэння да ліку абраных. Вытворцы прадуктаў настолькі захапіліся ярлыкамі «без ГМА», што лепяць яго нават на соль. Хоць адкуль у солі ўзяцца ГМА? І сапраўды, адна рэч — проста здаровае харчаванне, іншая — далучэнне праз ежу да ліку нейкай эліты. Адкрываюцца, напрыклад, кавярні для «сыраежак», у якіх прадаецца штосьці высушанае і спрэсаванае, падобнае на кардон, затое без цеплавой апрацоўкі. І знаходзяцца ж прыхільнікі. Вы супраць? Вой, пэўна, вы яшчэ не дараслі да гэтых «ведаў»… Псіхолагі кажуць, што прыняцце ўсялякіх дзіўных «ведаў» ёсць не што іншае, як пошук спакою, пачуцця кантролю над уласным жыццём. Гэта так прадказальна: дастаткова есці сырую грэчку і не есці гамбургераў — і ты такі малайчына!

Аднак усё гэта не «здарава» і не «здарова». Ужываць смачную і здаровую, а часам і нездаровую ежу — гэта магчымасць дадаць фарбаў, смаку і паху нашаму жыццю. Дый нагул, ніхто да канца не ведае, якія прадукты сапраўды карысныя і ад чага трэба адмовіцца цалкам. Узяць хоць бы той жа халестэрын. Адны даследаванні паказваюць яго шкоду, а іншыя гэтага не пацвярджаюць.



**Адкрываюцца, напрыклад, кавярні для «сыраежак», у якіх прадаецца штосьці высушанае і спрэсаванае, падобнае на кардон, затое без цеплавой апрацоўкі. І знаходзяцца ж прыхільнікі.**

Той, хто надта імкнецца кантраляваць сітуацыю і перакананы, што гэта яму ўдаецца на сто працэнтаў, на самой справе можа не заўважаць, што сама сітуацыя ўжо даўно яго кантралюе. **Па сутнасці, чалавек, які ні ў чым не здольны кантраляваць сваё жыццё, намагаецца кантраляваць хоць бы сваё харчаванне ці, лепей сказаць, яго адсутнасць. І чым больш у гэтай асобы нявырашаных праблем, тым мацней яна будзе непакоіцца пра лісцік салаты.**

Час ад часу лепей ужываць што-небудзь не такое ўжо здаровае, але смачнае, каб забяспечыць сабе хвалю пазітыўных эмоцый. І такая хваля не можа быць адной у жыцці. Так ёсць магчымасць не зарабіць сабе дэпрэсію.

Калі вы зараз займаецеся выхаваннем дзяцей, паспрабуйце не выхаваць будучых артарэксікаў. Вучыце дзіця строіць стасункі з людзьмі, кантраляваць і выказваць свае пачуцці і эмоцыі, адэкватна ацэньваць сябе і свае магчымасці. Уся ваша сям'я павінна дакладна адрозніваць здаровы лад жыцця ад назойлівых паводзін, якія праз нейкі час могуць ператварыцца не толькі ў харчовую залежнасць, але і ў працагалізм, сексагалізм, гульняманію і дэпрэсію. Самае важнае — заўсёды быць праўдзівым з самім сабой. Ёсць праблемы (з сябрамі, настаўнікамі, пошукам працы) — трэба іх вырашаць.

■ Доктар адкажа

# Што даваць, каб не абсыпала?

***«Раскажыце, калі ласка, якім павінна быць харчаванне дзіцяці з алергічным дэрматозам. Што такое гіпаалергенная дыета?»***

**Валянціна Адамаўна,** *г. Брэст.*

Тлумачыць **урач-дэрматавенеролаг Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Надзея МІЛЬКОТА:**

— Вядома, што дзеці на штучным выкормліванні маюць вельмі высокую рызыку развіцця алергіі. Звычайна першыя праявы заяўляюць аб сабе з пачатку прыкорму. Чырвоныя плямкі рознага памеру на розных частках цела могуць з'явіцца не абавязкова ў першыя гадзіны пасля ўжывання прадукту, але і праз некалькі тыдняў. Гэта і ёсць алергадэрматоз, і самым важным у прафілактыцы і комплексным лячэнні такіх дзяцей будзе гіпаалергенная дыета.

У лячэбным харчаванні варта мець на ўвазе тры прынцыпы. Па-першае, з харчавання неабходна выдаліць алергены (іх можна выявіць самастойна шляхам уласных назіранняў або з дапамогай скурных і лабараторных тэстаў). Нельга даваць дзіцяці прадукты з экстрактыўнымі рэчывамі, кансервантамі, фарбавальнікамі. Па-другое, у харчаванні павінны прысутнічаць прадукты, якія будуць спрыяць нармальнай рабоце арганізма. Па-трэцяе, варта адэкватна замяніць выдаленыя прадукты на натуральныя або спецыялізаваныя лячэбныя. Кулінарная апрацоўка павінна быць ашчаднай — рэкамендуецца гатаваць на пары, запякаць або тушыць. Падаваць у цёплым выглядзе. Бульбу папярэдне здрабняць, вымочваць у халоднай вадзе цягам некалькіх гадзін. Мяса двойчы выварваць.

### Гіпаалергенная дыета прадугледжвае…

**ВЫКЛЮЧЫЦЬ:** булёны, вострае, салёнае, смажанае, вэнджанае, каўбасныя вырабы, печань, рыбу, ікру, морапрадукты, яйкі, вострыя гатункі сыру і сыр плаўлены, марожанае, кетчуп, маянэз, салёныя агуркі, радыску, рэдзьку, шпінат, шчаўе, перац, таматы, квашаную капусту, арэхі, грыбы, маргарын, квас, газіраваныя напоі, каву, какаву, мёд, шакалад, жуйкі, тарты, зефір, карамель, цытрусавыя, маліну, клубніцы, суніцы, абрыкосы, персікі, вінаград, ківі, гранаты, ананасы, дыню, кавун, абляпіху.

**АБМЕЖАВАЦЬ:** макарону, манныя крупы, хлеб з мукі вышэйшых гатункаў, неразведзенае малако, смятану, тварог, ёгурты з фруктовымі напаўняльнікамі, масла, курыцу, бараніну, раннюю гародніну, моркву, рэпу, цыбулю, часнок, буракі, вішні, парэчкі, журавіны, ажыны, бананы, шыпшыну.

**РЭКАМЕНДУЕЦЦА:** крупы (акрамя маннай), кісламалочныя прадукты (кефір, біякефір, ёгурты без дабавак), поснае мяса, капуста, кабачкі, светлы гарбуз, патысоны, пятрушка, кроп, зялёны гарошак, стручковая фасоля, белыя і зялёныя яблыкі, грушы, белыя і чырвоныя парэчкі, светлыя чарэшні, слівы, таплёнае сметанковае масла, алей, фруктоза, хлеб пшанічны другога гатунку, хлябцы зерневыя, несалодкія рысавыя і кукурузныя шматкі і палачкі.

Пасля 3-х гадоў гэтая дыета можа паступова пашырацца, але пад строгім абмежаваннем застануцца арэхі, цытрусавыя, шакалад, какава, мёд, рыба, кава…

### Маміна малако

***Аптымальным відам выкормлівання дзяцей першага года жыцця з рызыкай атапічных захворванняў з'яўляецца грудное малако. Пры немагчымасці працягваць груднoе кармленне дзіця пераводзяць на прафілактычныя сумесі на аснове прадуктаў частковага гідролізу малочных бялкоў.***

■ Інтэрв'ю на тэму



## Ганна ТАРАСЮК:

# «ЛЮДЗІ НЕ ЗДАЮЦЬ ТЭСТ НА ВІЧ, БО БАЯЦЦА, ШТО ІХ ЖЫЦЦЁ ЗМЕНІЦЦА»

**Экспертны савет Інфармацыйнай стратэгіі па ВІЧ/СНІД у Беларусі працягвае цыкл тэматычных інтэрв'ю з людзьмі розных прафесій, узросту, сацыяльнага статусу. На гэты раз сваімі думкамі дзеліцца юная кідальніца кап'я з Мінска Ганна ТАРАСЮК. Яна вучыцца ў 11-м класе сталічнай гімназіі № 16. У арсенале дзяўчыны ўжо некалькі сур'ёзных перамог. Ганна — чэмпіёнка юнацкіх Алімпійскіх гульняў 2014 года па кіданні кап'я, чэмпіёнка Сусветнай гімназіяды, чэмпіёнка Еўразійскіх гульняў, стыпендыят прэзідэнцкага спартыўнага клуба.**

***— Ганна, якія шляхі перадачы ВІЧ ты ведаеш?***

— Праз кроў, палавыя сувязі.

***— Што ты ведаеш аб лячэнні ВІЧ-інфекцыі і яго эфектыўнасці?***

— Ведаю, што лекаў ад ВІЧ няма, але ёсць розныя прэпараты, якія могуць запавольваць распаўсюджванне інфекцыі ў арганізме, прыгнятаць яе развіццё.

***— Калі людзі перастануць паміраць ад СНІДу? Што трэба зрабіць для прадухілення гэтых смерцяў?***

— Я думаю, гэта ніяк не спыніць. Таму што ёсць людзі, якія ведаюць, што хварэюць, і наўмысна заражаюць іншых людзей. І нават калі з'явяцца лекі, то ўсё роўна ўсіх не вылечыш. Ёсць і тыя, хто не ведае, што хварэе. Жывуць палавым жыццём і заражаюць ненаўмысна, і ад гэтага нікуды не падзенешся.

***— Ты часта сустракаеш у СМІ інфармацыю пра ВІЧ/СНІД?***

— Даволі часта. Як на інтэрнэт-рэсурсах, так і ў газетах, часопісах. На мой погляд, пісаць трэба ўсё ж такі яшчэ больш.

***— Ці актуальная для цябе тэма ВІЧ?***

— Вядома, я чытаю штосьці і таму ведаю, як там усё… Як паводзіць сябе трэба, засцерагацца. Чым больш людзі будуць ведаць, тым лепш. Трэба інфармаваць народ. Яшчэ ў школе пастаянна кажуць, што калі раптам сярод нас з'явіцца ВІЧ-інфіцыраваны, то мы не павінны яго цурацца. У мяне няма знаёмых з ВІЧ, не ведаю, як бы я сябе паводзіла… У любым выпадку, такіх людзей трэба падтрымліваць.

***— Ты здавала тэст на ВІЧ?***

— Не. Для спаборніцтваў здавала кроў, але не на ВІЧ. Было б выдатна: выпускаешся са школы — пайшоў і правэрыўся. Гэта, вядома, можа адбіцца на будучыні — калі вынік будзе станоўчым. У медкарце будзе ўказана, што ты хворы, і ўсе даведаюцца… Але я ўсё роўна лічу, што чым раней даведаешся, тым лягчэй будзе. Праз год мне 18, і я не збіраюся адмаўляцца ад тэста. Трэба глядзець праўдзе ў вочы.

***— А што перашкаджае людзям добраахвотна здаваць тэст на ВІЧ?***

— Людзі могуць падазраваць, што ў іх ёсць ВІЧ, але баяцца пацвярджэння. Баяцца, што іх жыццё зменіцца.

**Кацярына НІКАНОВІЧ**

### ВІЧ перадаецца

***1. Пры неабароненым палавым кантакце з ВІЧ-інфіцыраваным.***

***2. Пры сумесным выкарыстанні з ВІЧ-інфіцыраваным шпрыцаў ці іголак.***

***3. Ад маці — дзіцяці (падчас цяжарнасці, родаў ці пасля родаў, з грудным малаком).***

*Астатнія шляхі сустракаюцца значна радзей. Сярод іх можна прыгадаць заражэнне пры пералíванні крыві ці яе прадуктаў у краінах, дзе адсутнічае абавязковая праверка ўсёй донарскай крыві на ВІЧ. Надзвычай рэдкія выпадкі заражэння пры трапленні інфіцыраванай крыві на адкрытую рану ці слізістую.* ***ВІЧ не перадаецца пры штодзённых бытавых кантактах*** *(карыстанні ванным пакоем і туалетам, калі піць з аднаго кубка). У медустановах не зарэгістравана ніводнага выпадку заражэння медработніка ад сліны, мачы ці крыві ВІЧ-пазітыўнага пацыента, якія трапілі на непашкоджаную скуру.*

### У палавых кантактаў — розная рызыка

***Сярод усіх спосабаў перадачы ВІЧ палавы кантакт застаецца на першым месцы, паколькі размова ідзе пра непасрэдны кантакт з біялагічнымі вадкасцямі, якія змяшчаюць вірус. Найбольш высокія канцэнтрацыі вірусных часціц выяўляюцца ў крыві і семявай вадкасці. Рызыка заражэння партнёркі пры палавым кантакце істотна ўзрастае, калі ў партнёра быў выразны сіндром імунадэфіцыту або сімптаматычная стадыя ВІЧ-інфекцыі. Дакладна разлічыць верагоднасць заражэння пасля палавога кантакту з ВІЧ-пазітыўным немагчыма. На рызыку інфіцыравання ўплывае мноства фактараў, у тым ліку від палавога кантакту і наяўнасць інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам.***

***У сітуацыях, калі цягам некалькіх дзён ці тыдняў паміж многімі людзьмі адбываецца абмен такімі біялагічнымі вадкасцямі, як кроў, вагінальны сакрэт, сперма, захоўваецца высокая верагоднасць таго, што ў ліку гэтых людзей акажацца нядаўна інфіцыраваны ВІЧ-носьбіт, рызыка заражэння ад якога вельмі высокая. Высокай рызыкай перадачы віруса характарызуюцца таксама познія стадыі захворвання. Самая нізкая рызыка — пры палавых кантактах з тымі «пазітыўнымі», якія атрымліваюць антырэтравірусную тэрапію, строга вытрымліваюць рэжым прыёму прэпаратаў, рэгулярна праходзяць медагляды і не маюць іншых захворванняў, што перадаюцца палавым шляхам.***

■ Асаблівасці захворвання

# Задавальненне… і яго наступствы

**Інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам, — гэта каля 30-ці бактэрыяльных, вірусных, грыбковых і паразітарных захворванняў, для якіх такі шлях перадачы з'яўляецца асноўным.**

Хто рызыкуе заразіцца інфекцыямі, што перадаюцца палавым шляхам? Той, хто мае шмат палавых партнёраў і не карыстаецца сродкамі засцярогі. Вядома, што большая рызыка заразіцца — у жанчын, і гэта абумоўлена асаблівасцямі іх фізіялогіі, нагадвае **інструктар-валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Кацярына БЛІЗНЮК.**

Палавыя інфекцыі выклікаюць у палавых шляхах запаленчы працэс, часцей за ўсё ён становіцца хранічным. Праблема ў тым, што ў выніку запалення ў жанчын, напрыклад, можа развіцца непраходнасць матачных труб, бясплоднасць, павялічваецца рызыка невыношвання цяжарнасці, заўчасных родаў, нараджэння дзіцяці з прыроджанай інфекцыяй. У мужчын можа наступіць не толькі бясплоднасць, але і імпатэнцыя.

Акрамя таго, вірусы папіломы чалавека выклікаюць рак шыйкі маткі.

Сімптомаў, па якіх можна западозрыць нядобрае, даволі шмат: выдзяленні з мочаспускальнага канала ці прамой кішкі, незвычайныя выдзяленні з похвы, у тым ліку крывяністыя паміж месячнымі; сверб, смыленне, пачашчанае мочаспусканне, боль унізе жывата і паясніцы ў жанчын, у яечках — у мужчын, балючыя адчуванні падчас палавога акта, язвачкі, эрозіі на палавых органах, у заднім праходзе, ротавай поласці, сып на целе, палавых органах, далонях, падэшвах, павелічэнне лімфавузлоў каля палавых органаў.

Ганарэя праз 3—5 дзён заяўляе аб сабе выдзяленнямі, пачырваненнем і пачашчаным балючым мочаспусканнем; герпес праз некалькі дзён — пачырваненнем, пухірамі, эрозіямі; трыхаманіяз праз 10—30 дзён — выдзяленнямі са спецыфічным пахам і свербам. Што да ВІЧ-інфекцыі, то цягам ад 1 года да 15-ці чалавек можа і не падазраваць аб інфіцыраванні. У гэты схаваны перыяд могуць назірацца сімптомы, падобныя на прастуду — тэмпература, дыярэя, павелічэнне лімфавузлоў.

**Неабаронены секс — гэта…**

вагінальны, аральны, анальны акт без прэзерватыва.

**Аварыйная сітуацыя — гэта…**

- разрыў прэзерватыва падчас любога палавога акта,
- любы неабаронены палавы акт.

У аварыйнай сітуацыі для прафілактыкі заражэння выкарыстоўваюцца антысептыкі:

хлоргексідыну біглюканат, гексікон, мірамістын, цыдыпол.

Без лячэння палавыя інфекцыі не праходзяць. Нельга займацца і самалячэннем, паколькі гэта не прастуда пасля пераахаладжэння.

Лячэнне, як правіла, уключае ў сябе антыбіётыкатэрапію, імунастымулюючую тэрапію, вітамінныя прэпараты, мясцовае лячэнне.

**Неабходна…**

1. Прайсці поўны курс лячэння і кантрольнае лабараторнае абследаванне.
2. Не перарываць курс, каб захворванне не вярнулася ў больш цяжкай форме.
3. Не ўжываць алкаголь цягам лячэння.
4. Прыпыніць палавыя кантакты.
5. Пралячыць палавога партнёра, нават калі пры абследаванні інфекцыя ў яго не выяўлена.

Матэрыялы выпуску падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

## ОТЧЕТ
**Минского социально-экономического фонда «Чистое действие» об использовании имущества за 2014 год**

Минский социально-экономический фонд «Чистое действие» зарегистрирован Управлением юстиции Минского городского исполнительного комитета решением №11 от 16.07.2014 и внесен в ЕГР за №194903732.

Адрес фонда: 220090, г. Минск, Логойский тракт, д. 22, корпус 2, к. 604

1. Учредители фонда – Свирко Ю.М., Важник А.О., Сацевич И.В., Соболь В.В., Кучеренко Е.В.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

- имущество, переданное учредителями (учредителем) фонда – 15 миллионов белорусских рублей;

- прочие доходы фонда не запрещенные законодательством Республики Беларусь, в том числе спонсорская, безвозмездная помощь – 224 миллиона белорусских рублей.

3. Информация о суммах расходов фонда:

- расходы, понесенные фондом на достижение общественно полезных целей, определенных уставом, – 33 миллиона белорусских рублей;

- прочие расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, в том числе расходы на содержание Фонда, – 31 миллион белорусских рублей.

4. Стоимость чистых активов фонда на 31 декабря 2014 года – 175 миллионов белорусских рублей.

5. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

УНП 194903732

## ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

*опубликованной 25 февраля 2014 г. в газете «Звязда»*

**по объекту Многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности №3 по генплану с помещениями общественного назначения, подземной автостоянкой в квартале улиц Одоевского, Бельского, Пономаренко, П.Глебки (продолжение) в г. Минске.**

Общество с ограниченной ответственностью «Антасам» информирует о дополнении к проектной декларации объекта долевого строительства, опубликованной в газете «ЗВЯЗДА» № 35 от 25 февраля 2014 г.:

**Внести следующие дополнения:**

Абзац «Для привлечения физических, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагаются:» **дополнить:**

7 (Семь) машино-мест в подземной гараж-стоянке. Цена 1 машино-места общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 274 910 000 (Двести семьдесят четыре миллиона девятьсот десять тысяч) белорусских рублей, эквивалентной 18 500 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 17 февраля 2015 г.;

1 (Одно) помещение на отметке 2/1-3/1;Ж/2-И2 площадью 33 м.кв. общей площади помещений общественного назначения в текущих ценах на момент опубликования проектной декларации составляет 14 860 000 (Четырнадцать миллионов восемьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей за 1 м.кв., что эквивалентно 1 000 долларов США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 17 февраля 2015 г.

УНП 100727641

## РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже незавершенного**

### незаконсервированного капитального строения производственного корпуса «Комплект 1-ЭГ»,

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 121А/48 и принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ» (Продавец)**

Земельный участок площадью 25,9447 га с кадастровым номером 500000000004002234.

Целевое назначение – эксплуатация и обслуживание административных и производственных зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Описание права, ограничения (обременения) прав: охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 0,0638 га, 0,1819 га, 0,0120 га, 0,0475 га, 0,0070 га; охранная зона водопровода, площадь 0,0189 га, 0,0150 га; охранная зона линий связи, площадь 0,0024 га; 0,0024 га; 0,0022 га; 0,0026 га; охранная зона электрокабеля, площадь 0,0040 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион.

Для обслуживания выставленного на аукционные торги Объекта предполагается передать Победителю аукциона (Претенденту на покупку) условно сформированный земельный участок площадью 1,1916 га и предоставить ограниченное право пользования земельным участком площадью 0,5602 га (земельный сервитут). Решение о выделении земельного участка будет приниматься в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь после определения Победителя аукциона (Претендента на покупку).

**Начальная цена с НДС – 21 415 584 000 бел. руб.**
**Задаток с НДС – 1 000 000 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»,* **проводимом 6 марта 2015 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона в размере 1% (одного процента) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Обязанность по оформлению всех документов, связанных с регистрацией сделки купли-продажи Объекта, оформлению прав собственности на Объект и выделению земельного участка возлагается на Победителя аукциона (Претендента на покупку). На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **06.03.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 04.03.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 09.10.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

***Уважаемые акционеры ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»!***

**Во Дворце культуры Слуцкого сахарорафинадного комбината по адресу: г. Слуцк, ул. Головащенко, 6, 20 марта 2015 года в 15.00 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ ГОДОВОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ открытого акционерного общества**

### «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет о результатах деятельности Общества за 2014 год и направлениях развития на 2015 год:

• Отчет Дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2014 году и основных направлениях деятельности Общества на 2015 год.

• Отчет Наблюдательного Совета ОАО о проделанной работе в 2014 году.

• Отчет Ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии в 2014 году и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету о прибылях и убытках, годовому отчету Общества.

• Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2014 год с учетом аудиторского заключения.

• Утверждение распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2014 г.

2. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества на 2015 год.

3. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2014 год, порядка и сроков выплаты дивидендов по 2015 году.

4. Утверждение размера, условий вознаграждения и компенсации расходов за исполнение своих обязанностей членам Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.

5. Избрание членов Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии Общества.

Список акционеров, имеющих право на участие в собрании, составляется **на 01.03.2015 года.**

Регистрация акционеров и их представителей будет осуществляться в день проведения собрания с 14.00 до 15.00 по месту его проведения.

Представителям акционеров при регистрации иметь паспорт, доверенность, оформленную в установленном порядке, акционерам – паспорт.

***Информацию (материалы) по вопросам повестки дня можно получить:***

- в рабочие дни – с 8.00 до 17.00 по месту нахождения Общества (холл 2-го этажа), начиная с 13 по 20 марта 2015 года (или по тел. 4-53-28);

- в день проведения собрания – по месту его проведения.

***Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».***

УНП 600075003

ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение**

### «Минскстрой»

УНП 100071315

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ДОПОЛНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой дом № 1 по генплану в квартале улиц Горецкого, Шаранговича, лесопарк «Медвежино» в г. Минске,** ***опубликованную в газете «Звязда» 06 февраля 2015 года:***

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади квартир №№ 10, 11, 12, 14, 15, 16, 18, 19, 20, 22, 23, 24, 26, 27, 28, 30, 31, 32, 34, 35, 36, 38, 39, 40, 42, 43, 44, 46, 47, 48, 50, 51, 52, 54, 55, 56, 58, 59, 60, 73, 74, 75, 77, 78, 79, 81, 82, 83, 85, 86, 87, 89, 90, 91, 93, 94, 95, 97, 98, 99, 101, 102, 103, 105, 106, 107, 109, 110, 111, 113, 114, 115, 117, 118, 119, 121, 122, 123, 127 с учетом выполнения внутренних отделочных работ составляет: 1-комнатные квартиры – 1300 долларов США, 2-комнатные квартиры – 1250 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты.

При 100% оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 200 долларам США и составит, соответственно, 1100 и 1050 долларов США. Акция действует до 10 марта 2015 года.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

*И.о. генерального директора* *Л.П.Стухальский*

УНП 100088694

**31 марта 2015 г. в 9.30 по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

### ЗАО «Возвышенность»

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 г.
2. Утверждение отчета Наблюдательного совета за 2014 г.
3. Отчет Ревизора за 2014 г.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности, счетов прибыли и убытков, распределение прибыли и убытков Общества за 2014 г.
5. Избрание членов Наблюдательного совета.
6. Избрание Ревизора Общества.

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1 с 09.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней, с предварительным телефонным уведомлением.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 8 часов 30 минут до 9 часов 25 минут в день и по месту проведения собрания. При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

***ЗАО «Возвышенность», г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, ком. 1.***

Утерянный представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0983939 **считать недействительным.**

УНП 100122726

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 18 марта 2015 года в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

Организатором аукциона является

### республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.**

<u>На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:</u>

**1.** Помещение №415, арендуемой площадью 23,9 кв.м, на четвертом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 609 450 рублей; размер задатка – 60 900 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**2.** Помещение №516, арендуемой площадью 73,3 кв.м, на пятом этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 1 869 150 рублей; размер задатка – 186 900 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**3.** Помещение №203, арендуемой площадью 32,4 кв.м, на втором этаже изолированного помещения по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 (литер Б 7/к), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 826 200 рублей; размер задатка – 82 600 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 18 февраля 2015 года по 16 марта 2015 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 16 марта 2015 года, не рассматриваются.**

*Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».*

<u>Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:</u>

*- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;*

*- подает заявление на участие в аукционе;*

*- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;*

*- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.*

<u>Помимо указанных документов:</u>

***- физическое лицо*** *предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель*** *– копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо*** *(резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и(или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 10 000 000 рублей.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 209-90-93, (8-017) 209-92-78.**

## ОАО «Амкодор-Дзержинск»

*222720, Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 25 марта 2015 г. в 15.00 по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 19, актовый зал Общества.**

Регистрация участников Собрания производится в день и по месту проведения собрания **с 14.00 до 14.55.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – **16 февраля 2015 г.**

Орган, созывающий собрание: Совет директоров.

Основание созыва собрания – решение Совета директоров Общества **от 9 февраля 2015 года.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – **16 февраля 2015 г.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Амкодор-Дзержинск» за 2014 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития ОАО «Амкодор-Дзержинск» на 2015 год.

2. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год.

3. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2014 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2015 год.

5. Об избрании членов Совета директоров, Ревизионной комиссии.

6. Об утверждении размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 19 марта 2015 г., в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (личный паспорт, для представителя акционера – доверенность или договор).

УНП 600005769. **Совет директоров ОАО «Амкодор-Дзержинск»**

**Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»**

**20 марта 2015 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

### ОАО «Мостоотряд №88»

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, второй этаж, приемная руководителя.**

*1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества в 2014 году и об основных направлениях деятельности общества в 2015 году.*

*2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2014 году. Оценка деятельности директора общества наблюдательным советом.*

*3. Утверждение заключения аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год, заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2014 год.*

*4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 год.*

*5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2014 год. О выплате дивидендов за 2014 год.*

*6. Утверждение направлений использования чистой прибыли общества в 2015 году. О выплате дивидендов в 2015 году.*

*7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.*

*8. Определение условий вознаграждения и компенсации для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 11 марта 2015 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в здании управления на втором этаже (приемная руководителя).

Регистрация участников собрания с **15.00** до **15.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 20 марта 2015 года в 15.30.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию **на 10 марта 2015 года.**

<u>Для регистрации при себе иметь следующие документы:</u> акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100299744 *Наблюдательный совет*

**Благотворительный местный фонд «Открытые сердца»**
**Отчет об использовании своего имущества за 2014 год.**

Количество учредителей благотворительного местного фонда «Открытые сердца» – 1 человек, из них 1 – физические лица.

Информация о стоимости имущества благотворительного местного фонда «Открытые сердца» (далее – Фонд):

- остаточная стоимость основных средств на 31.12.14 г. составляет 8000698 рублей, в том числе: Видеокамера Панасоник – 6436 981 рубль, Ксерокс – 523 715 рублей, Принтер – 525 702 рубля, Принтер – 514 300 рублей.

- Поступлений из иных источников, не запрещенных законодательством, – 157806201 белорусский рубль.

Общая сумма расходов, понесенных Фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в Уставе Фонда, составляет 155254243 белорусских рубля. В том числе:

- на выплату заработной платы, пособия по уходу за ребенком и хозяйственных расходов – 99851793 рубля;

- на оплату налогов и обязательных платежей из ФЗП 4697952 рубля;

- на оплату поставщикам (буклеты, листовки) – 47526270 рублей;

- прочие платежи (вознаграждения банку и др.) – 3178228 рублей.

Фонд не является учредителем унитарных предприятий, участником в иных хозяйственных обществах, юридических лицах, созданных для осуществления предпринимательской деятельности.

УНП 790627109

**Наблюдательный совет**

### ОАО «Универсам Рига»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 25 марта 2015 года в 13.00 СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

**1.** Об итогах работы Общества в 2014 году и основных направлениях деятельности Общества на 2015 год.
**2.** Отчет Наблюдательного совета и ревизионной комиссии о проделанной работе в 2014 году.
**3.** Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках за 2014 год.
**4.** Утверждение порядка распределения чистой прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2014 год, размера и даты выплаты дивидендов за 2014 год.
**5.** Утверждение плана распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия на 2015 год.
**6.** Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Собрание состоится по адресу: **г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».**

Регистрация акционеров (их представителей) будет проводиться в день собрания **с 12.30 до 13.00.**

<u>При регистрации акционеры обязаны предъявить</u> документ, удостоверяющий личность; представитель акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100299678 *Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»*

***Уважаемые акционеры ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»***

**19 марта 2015 г. в 15.00 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

### ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

**по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (актовый зал).**

<u>**ПОВЕСТКА ДНЯ:**</u>

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» в 2014 году и основных направлениях деятельности Общества на 2015 год.

2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» о проделанной работе за 2014 год.

3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2014 год и заключение по бухгалтерскому балансу, отчету прибылей и убытков, годовому отчету ОАО «Пищевой комбинат «Веселово». Ознакомление с заключением аудиторов.

4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках за 2014 год.

5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2014 год. О выплате дивидендов за 2014 год.

6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» на 2015 год.

7. Избрание членов наблюдательного совета и членов ревизионной комиссии ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».

8. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.

9. О внесении изменений в Устав ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».

Список участников собрания будет сформирован по состоянию реестра **на 19 февраля 2015 г.**

Регистрация участников собрания будет проводиться **с 14.00 до 14.45** по месту проведения собрания.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: **Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24.**

<u>Для регистрации участникам собрания при себе необходимо иметь</u> паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).

СПРАВКИ ПО ТЕЛЕФОНУ (80177) 93 34 10.

УНП 690277551

***Уважаемые акционеры ОАО «Универмаг «Солигорск»!***

**«24» марта 2015 года состоится общее собрание акционеров**

### ОАО «Универмаг «Солигорск»,

**расположенного по адресу: 223710, Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39. Собрание пройдет по адресу: г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4 этаж, актовый зал**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и об основных направлениях деятельности Общества в 2015 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета Общества за 2014 год.
3. Отчет о работе ревизионной комиссии Общества за 2014 год. Заключение по результатам проведенной ревизии финансово-хозяйственной деятельности Общества по годовому отчету и бухгалтерскому балансу.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год с учетом аудиторского заключения.
5. Утверждение распределения и использования чистой прибыли Общества за 2014 год.
6. Утверждение направлений и нормативов распределения и использования чистой прибыли Общества на 2015 год.
7. Утверждение размера, порядка и сроков выплаты дивидендов за 2014 год.
8. Периодичность выплаты дивидендов за 2014 год.
9. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
10. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
11. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 4 этаж, кабинет «Отдел кадров» с 13 марта по 23 марта 2015 года в рабочие дни (время работы с 8.00 до 17.00) либо 24 марта 2015 года по месту проведения собрания.**

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 24 марта 2015 года, 14.00.**

Список лиц, имеющих права на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на **02 марта 2015 года.**

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

УНП 600024725

### ОАО «Строительный трест №9, г. Витебск»

**извещает своих акционеров о проведении 18 марта 2015 года ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества в 2014 году и основных направлениях развития общества на 2015 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2014 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 год.
5. Утверждение порядка распределения чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли, которая будет получена в 2015 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав общества.

Собрание состоится **в 14.00** в здании ЧУП «Витебский учебный центр профсоюзов» по адресу: **г. Витебск, ул. Правды, 8а, 2-й этаж.**

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по состоянию реестра **на 1 марта 2015 г.**

Регистрация акционеров проводится **с 13.10 до 13.45.**

**Акционерам при себе иметь паспорт, представителям – доверенность.**

**Справки по телефону (8-0212) 60 28 93.**

С материалами собрания можно ознакомиться с 9 марта 2015 года в общем отделе ОАО «Строительный трест №9, г. Витебск» по адресу: **г. Витебск, ул. Правды, 5.**

УНП 300029266 *Наблюдательный совет*

### ОАО «Белхимэнерго»

**уведомляет акционеров о проведении очередного годового Общего собрания акционеров Общества 27 марта 2015 года в 11.00 по месту нахождения Общества по адресу: г. Минск, пер. Асаналиева, 3.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Избрание председателя Общего собрания акционеров.
2. Утверждение отчета ревизионной комиссии.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
4. Распределение прибыли и убытков.
5. Объявление размеров дивидендов и определение срока их выплаты.
6. Избрание Наблюдательного совета.
7. Избрание Ревизионной комиссии.

Регистрация участников осуществляется **с 10.00 до 11.00.**

<u>При регистрации участники обязаны предъявить</u> документ, удостоверяющий личность, представители участников – документ, удостоверяющий личность и доверенность.

С материалами к собранию можно ознакомиться после **01 марта 2015 года по адресу: г. Минск, пер. Асаналиева, 3.**

УНН 100363932.

**Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»** УНН 100286677

### АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:

**• кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: дацэнт.**

Наш адрас: **220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. Аддзел кадраў.**

### ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»,

*220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**Собрание состоится 27 марта 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П.Бровки, 8, актовый зал Общества.**

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания **с 13.30 до 14.45.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, – **16 февраля 2015 года.**

Орган, созывающий собрание: Совет директоров.

Основание созыва собрания: решение Совета директоров от 23 января 2015 г. (протокол № 419).

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» за 2014 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» на 2015 год.

2. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2014 год.

3. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2014 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2015 год.

5. Об избрании членов Совета директоров, Ревизионной комиссии.

6. Об утверждении размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 20 марта 2015 г. в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга» с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении ими личного паспорта и документов, подтверждающих их полномочия: для доверенных лиц – надлежащим образом оформленной доверенности, для руководителей юридических лиц – выписки из ЕГР или заверенных копий приказа о вступлении в должность, либо протокола о назначении руководителя.

По окончании регистрации (после 14.45) опоздавшие акционеры (их представители) в зал проведения собрания не допускаются и не регистрируются.

***Совет директоров ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»***

УНП 100135676.

■ Гарадскія прыгоды

# ДЗЕ Ў МІНСКУ ЖЫВЕ КАХАННЕ?

## Карэспандэнты «Звязды» паспрабавалі гэта высветліць з дапамогай... смартфонаў



**Гарадскія квэсты даўно здабылі папулярнасць у аматараў актыўных відаў адпачынку. Магчыма, найлепшае спалучэнне фізічнай і інтэлектуальнай актыўнасці — бегаць па горадзе, адначасова шукаючы адказы на загадкі арганізатараў. Пра самыя розныя віды «Схватак» і «Пошукаў» прэса пісала ўжо не раз. Але адзін з апошніх праектаў, стваральнікі якога, відавочна, натхняліся гэтай айчыннай забавай, зацікавіў карэспандэнтаў «Звязды». Праект Shukaj.by прэзентаваў сваю гульню, прымеркаваную да Дня святога Валянціна, у якім гульцам прапаноўвалася не толькі лепш спазнаць беларускую сталіцу, але і знайсці... каханне. Нашы журналісты паўдзельнічалі ў квэсце, а што з гэтага выйшла — чытайце ў матэрыяле.**



Удзельнікі ўважліва вывучаюць памятны знак.

Галоўнае, што адрознівала квэст «Дзе ў Мінску жыве каханне?» ад астатніх — поўная свабода. Калі звычайна ўсе каманды стартуюць у адзін і той жа час, робяць усё на хуткасць і імкнуцца апярэдзіць канкурэнтаў, то тут прапаноўвалася прыйсці 14 лютага на плошчу Восьмага сакавіка ў любы зручны час. Адзіная ўмова — наяўнасць смартфона з падключэннем да інтэрнэту (праз яго гульцы атрымлівалі заданні).

Гульню пачынаем роўна апоўдні. Стоячы на плошчы 8-га сакавіка, загружаем галоўную старонку сайта і атрымліваем першае заданне. Арганізатары просяць нас пафантазіраваць і ўявіць, якімі былі гэтыя мясціны Мінска (ці, правільней сказаць, Менска або нават Менеска) амаль тысячу гадоў таму. Мы на Ніжнім рынку: вакол гандляры, рамеснікі, пакупнікі… Раптам здараецца нечаканае — аднекуль з'яўляецца цмок, які выкрадае з натоўпу прыгожую дзяўчыну. Наша задача, вядома,— яе выратаваць. А каб даведацца, куды паляцеў цмок, трэба знайсці волата, які стаіць каля будынка першай гарадской каменнай царквы. Царквы, зразумела, даўно няма, а вось памятны знак аб яе колішнім існаванні ў сучасным Мінску знайсці можна.

Вось вам і першая неспадзяванка — ці многія ведаюць, дзе ў беларускай сталіцы была пабудавана першая каменная царква? Спачатку разлічваем толькі на свае веды — пачынаем кружыць вакол Свята-Духава сабора. Здаецца відавочнай думка, што першую царкву пабудаваць маглі менавіта тут — на ўзвышшы Замкавай гары. Такім чынам будынак штучна здаваўся б вышэйшым, а значыць, і бліжэйшым да Бога… Але нічога не выходзіць — знаходзім толькі некалькі не заўважаных раней шыльдаў ды скульптуру з шалямі каля гарадской ратушы. Прыходзіцца звярнуцца да заўсёднага памочніка тых, хто прагне ведаў,— пошукавай сістэмы ў інтэрнэце.



«Сэлфі» ўдзельнікаў у лабірынтах Траецкага прадмесця.

Адтуль і даведваемся, што шукалі зусім не там. Старажытныя архітэктары выбралі, пэўна, не менш маляўнічае месца — на самым узбярэжжы Свіслачы, там, дзе цяпер знаходзіцца Дом фізкультуры. Нас збілі з панталыку будаўнікі сярэдзіны мінулага стагоддзя, якія моцна змянілі рэльеф у гэтым месцы. Раней навышэйшы пункт Замкавай гары быў якраз тут. На месцы сустракаем і канкурэнтаў — шматлікія парачкі са смартфонамі і планшэтамі ўважліва вывучаюць памятны знак, шукаючы патрэбныя для пераходу на наступны ўзровень лічбы. Усе шчыра захопленыя гульнёй — адгадаўшы, што трэба зрабіць, гучна смяюцца і накіроўваюцца па далейшыя прыгоды. Мы таксама ўводзім адказ і рухаемся далей.

> **Галоўнай нашай задачай было распавесці пра гісторыю Мінска ў простай, цікавай і захапляльнай форме. Квэст для гэтага падыходзіць як найлепш.**

Арганізатары праз смартфон распавядаюць нам легенды пра старажытны Менск, волата Менеска, прыгажуню Свіслач і яе каменныя пірагі, паралельна даючы ўсё новыя і новыя заданні. Мы шукаем барэльеф з вінаградам і сэрцамі, потым накіроўваемся ў бок Траецкай гары, каб знайсці «дзяўчыну ў ажурнай сукенцы, якая стаіць, хоць і не мусіць гэтага рабіць». Пераводзім рымскія лічбы ў арабскія, лічым дзірачкі на галаўных уборах статуй… Другі раз збіваемся з правільнага маршруту, адгадваючы загадку пра Жыжаля — бога агню і рамёстваў. Успомніўшы першую «зону адказнасці» славянскага бога, думаем, што адказ трэба шукаць у раёне пажарнага дэпо на вуліцы Гарадскі Вал. Але ўжо па дарозе нас азарае: Траецкае прадмесце — гэта ж рамесніцкі цэнтр!

Але і тут злосны цмок не здаецца — ён хаваецца ад нас у сваіх сутарэннях, па-сучаснаму — у метро. Даганяем яго там, дзе ўсё пачыналася — на Нямізе. І тут прыходзіцца ўзгадаць некалькі першых заданняў. Рухаемся па вуліцы Зыбіцкай, акунаючыся ў атмасферу старога горада. Шукаем шыльду з імёнамі тых, без каго гэтай шыльды (а таксама і газеты «Звязда») магло б і не быць і, вядома, знаходзім. Яшчэ колькі хвілін — і цмокаў хвост ужо ў руцэ звяздоўцаў. Уводзім адказ на апошняе і галоўнае пытанне гульні, пасля чаго атрымліваем віншаванні і падарункі арганізатараў: кубачак гарбаты, печыва і прыгожую паштоўку на выбар. Спыняемся на варыянце з вершам Яўгеніі Янішчыц «Мова», напісаным у вялікім сэрцы — Дзень святога Валянціна, як-ніяк… Сапраўды, калі не каханне, дык любоў да роднага горада ў такой гульні здабыць вельмі проста! Ужо развітваючыся, задаём некалькі пытанняў **аднаму з арганізатараў квэсту Яраславу ЛІХАЧЭЎСКАМУ.**



Рамантычныя закуткі Траецкага прадмесця сталі пляцоўкай для гульні.

Усё новыя і новыя заданні водзяць нас па закутках прадмесця, прымушаючы заўважыць тое, чаго раней не бачылі. Дзіўна: усё жыццё пражылі ў сталіцы, а здольныя знаходзіць столькі новага! Пасля Траецкага аўтары квэсту прапануюць нам зрабіць невялікі шпацыр па набярэжнай, якая літаральна ў гэтыя дні атрымала назву ў гонар воінаў-інтэрнацыяналістаў. Толькі тут узгадваем, што гуляем не дзеля перамогі,— нам раяць падняцца на аглядную пляцоўку гасцініцы «Беларусь» і паўгадзіны адпачыць, любуючыся відамі зімняй сталіцы.

Яшчэ колькі заданняў — і мы ўжо амаль дагналі цмока! Шукаць яго трэба на Цмокавай (або Змяёвай) гары. І гэта не фантазія арганізатараў, такі тапонім сапраўды калісьці існаваў у Мінску. Дзе шукаць тую гару? Не будзем раскрываць інтрыгу, квэст дагэтуль даступны для ўдзелу ў любы зручны час, паспрабуйце знайсці яе самі.

— Галоўнай нашай задачай было распавесці пра гісторыю Мінска ў простай, цікавай і захапляльнай форме,— расказвае Яраслаў.— Квэст для гэтага падыходзіць як найлепш. Гэтая гульня — толькі першы, пілотны праект з шэрагу падобных. У аддаленай перспектыве мы плануем скласці цэлую сістэму такіх квэстаў па розных гарадах Беларусі і такім чынам падтрымаць айчынны турызм. Я чуў, што існуюць зборнікі квэстаў па асобных гарадах, але такіх глабальных, па цэлых краінах,— не. Таму, калі ўсё атрымаецца, мы станем першапраходцамі, а Мінск атрымае сваю непаўторную турыстычную рысу.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**



Тая самая дзяўчына ў сукенцы, якая стаіць, хоць і не павінна.

Фота Надзеі БУЖАН.

# Масленіца ідзе, блін ды мёд нясе

**Па гарызанталі: 1.** Шырокі .... Дзень масленічнага тыдня, калі выбіралі пастуха на наступны год, а зяці завіталі да сваіх цешчаў «на бліны». **3.** ..., або пудзіла; спальванне на Масленіцу ... сімвалізавала канец зімы і надыход вясны. **7.** «Лятуць гусі ў ... радзімы,\\бы вясна ляціць». З верша Л.Геніюш «Лятуць гусі». **9.** Кусок дрэва; на Масленіцу ... прывязвалі тым хлопцам, якія за час паслякаляднага мясаеду не паспелі ажаніцца, а калі хто не жадаў яе цягаць, то мусіў адкупіцца. **10**. Дарожны куфэрак. **13**. Інструмент для праколвання адтулін; у першы дзень Вялікага посту ім выкалупвалі з зубоў скаромнае, і паласкалі рот гарэлкай. **14**. Блін не сноп, на ... не наколеш (прык.). **15**. Не ўсё кату Масленіца, бывае і Вялікі ... (прык.). **16**. На Хвядота занос — усё ... знясе (прыкмета). Прысвятак Хвядот адзначаўся 15 сакавіка. **19**. «Цешыцца ... з калінаю,\\Скінуўшы зімнія чары». З верша Я.Купалы «... і каліна». **20**. Адна з назваў Масленіцы. **22**. Пайменаваная вобласць на носьбіце інфармацыі. **24**. Тоўстыя бліны; на Масленіцу людзі частавалі імі сваю карміліцу — кароўку. **25**. Блінцы, блінчыкі, бліны, як ... ў вясны (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Вадаплаўная птушка. **2.** Тэатральная галёрка (уст.). **3.** «Жаваранкі-жавароначкі! Прыляціце да нас,\\Прынясіце нам ... цёплае». З вяснянкі. **4.** Адзінка плошчы ў Кітаі. **5.** Тое, на чым гушкаюцца; магічны сэнс гушкання на Масленіцу — каб лён доўгі рос. **6.** «А ў нас сёння ..., ...,\\А з-пад куста ластаўка, ластаўка». З вясновай масленічнай песні. **8.** Карыстанне, ужытак. **11**. Песні, ..., карагоды; тое, без чаго не абыходзіцца святкаванне Масленіцы. **12**. Пост падняў ..., а мне Масленіца (прык.). **17**. «Ой, ..., ... вясёлая,\\Нарасла трава зялёная — у-у-у!». З вяснянкі. **18**. ... і пацалункі лік не любяць (прык.). **20**. Да Дабравешчання зіму не лай і ... трымай (прык.). **21**. Гатунак белай гліны, што ідзе на выраб фаянсу. **23**. Хімічны элемент, крышталічнае рэчыва цёмна-шэрага колеру.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г. Дзяржынск.*




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Чацвер. 3. Лялька. 7. Край. 9. Калодка. 10. Баул. 13. Шыла. 14. Вілы. 15. Пост. 16. Сена. 19. Явар. 20. Сырніца. 22. Файл. 24. Аладкі. 25. Калёсы. **Па вертыкалі:** 1. Чайка. 2. Раёк. 3. Лета. 4. Лі. 5. Арэлі. 6. Масленка. 8. Абыходак. 11. Жарты. 12. Хвост. 17. Васна. 18. Бліны. 20. Сані. 21. Апак. 23. Ёд.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Ківі ў хатніх умовах



**Вырасціць лазу ківі цалкам рэальна, а яшчэ гэта займальна і не патрабуе спецыяльных выдаткаў. Трэба проста выбраць самы спелы плод у бліжэйшай краме. Ён павінен быць мяккім, роўным. Існуе некалькі папулярных гатункаў ківі, але не кожны з іх здольны вырасці і развіцца ў дарослую расліну ў хатніх умовах. Ківі вельмі любіць святло і цяпло, таму для яго пасадкі і вырошчвання трэба знайсці месца на сонечным падаконніку без скразнякоў.**



Лепшы час для пасеву — з сакавіка па май.

Мыем плод і разразаем яго на некалькі частак. Расціскаем акуратна мякаць. Атрыманую кашыцу кладзем у шклянку з цёплай вадой, перамешваем і даем трохі адстаяцца.

Добра прамываем, каб засталіся толькі костачкі, якія будуць плаваць на паверхні. Выкладваем насенне на сурвэтку або папяровы ручнік, каб яно падсохла. Праз 2—4 гадзіны загортваем костачкі ў вату або тканіну і кладзем на талерку. Дабаўляем трохі гарачай вады, каб яна прамачыла матэрыял, але не вылівалася пры нахіле талеркі. Накрываем насенне плёнкай і ставім у цёплае сонечнае месца. На ноч плёнку лепш прыпадымаць або зусім зняць. Раніцай даліваем неабходную колькасць вады. Праз 7—10 дзён насенне ківі павінна прарасці.

Выбіраем прыдатны для расліны гаршчок і насыпаем на яго дно керамзіту. Грунт лепш узяць гатовы, прызначаны для трапічных ліян. Вельмі добра будзе патрымаць яго на вадзяной лазні на працягу дзвюх гадзін. У лункі глыбінёй 5—10 мм кладзем па 2—3 костачкі. Крыху прысыпаем іх зямлёй, паліваем вадой пакаёвай тэмпературы і шчыльна накрываем плёнкай. Ставім гаршчок у цёплае сонечнае месца. Праз 3—6 дзён з'явяцца першыя ўсходы. Ад неперспектыўных і непатрэбных парасткаў лепш пачаць пазбаўляцца ўжо на гэтым этапе. Паліваем умерана і толькі адстоенай вадой. Узімку рост парасткаў ківі запавольваецца, і іх дастаткова паліваць 2—3 разы на месяц. У перыяд вегетацыі (вясной і летам) раслінам патрабуецца больш вільгаці, таму паліваць трэба часцей — 2 разы на тыдзень. Акрамя таго, гарачым летам ківі трэба апырскваць.



Рэгулярна прарэджвайце расліны, каб яны не перашкаджалі адна адной. На ранніх этапах іх можна проста выдзіраць з зямлі. Крыху пазней гэта зрабіць ужо не атрымаецца, бо каранёвая сістэма ў ківі развіваецца даволі хутка. Самым правільным варыянтам будзе састрыгаць непатрэбныя парасткі. Калі расліны дасягнуць у вышыню 10—12 см, перасадзім іх у асобныя пасудзіны. Калі гэтага не зрабіць, іх развіццё замарудзіцца. У спрыяльных умовах цвісці і пладаносіць ківі з насення пачынае на трэці ці чацвёрты год.

# Цяжкасці пры вырошчванні хоі

- Лісты могуць бляклець, скручвацца або засыхаць пры вельмі нізкай тэмпературы ці лішку асвятлення.
- Ападанне лісця можа быць выклікана вельмі гарачым і сухім паветрам.
- Пупышкі кветак ападаюць пры недахопе вільгаці або пры залішнім паліве. Гэта адбываецца і пры занадта сухім паветры.
- Парасткі і лісты могуць абсыпацца пры дрэнным дрэнажы або пры паліве занадта халоднай вадой.
- Залішні паліў разам з дрэнным дрэнажом могуць паслужыць прычынай гніення каранёў і ніжняй часткі сцябла.
- Кветкі ападаюць, калі недастатковае асвятленне, а таксама калі расліну пераставіць у іншае месца падчас цвіцення.



- Лісты бляклець, рост хоі тармозіцца пры недахопе азоту ў глебе. Для выпраўлення сітуацыі трэба падкармліваць расліну мачавінай (1 г на літр).
- Лісты будуць жоўкнуць, вянуць і ў выніку ападаць, калі расліну заліваць, або, наадварот, недастаткова паліваць. Яшчэ адной прычынай можа быць занадта нізкая тэмпература паветра.
- Часцей за ўсё расліна пакутуе ад шчытоўкі, тлі і белакрылкі. Павуцінавы клешч і мучністы чарвец таксама ласуюцца хояй.

## ПЫТАЛІСЯ — АДКАЗВАЕМ

**Якая павінна быць глыбіня ўрадлівага слою на ўчастку, каб вырасціць неабходныя культуры?**

| | |
|---|---|
| Дрэвы | 25-30 см |
| Кусты | 20 см |
| Шматгадовыя травяністыя расліны | 15 см |
| Газон | 10 см |

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 8.24 | 18.24 | 10.00 |
| Віцебск | 8.16 | 18.11 | 9.55 |
| Магілёў | 8.14 | 18.14 | 10.00 |
| Гомель | 8.07 | 18.14 | 10.07 |
| Гродна | 8.38 | 18.40 | 10.02 |
| Брэст | 8.35 | 18.44 | 10.09 |

**Месяц**

*Маладзік у 1.47.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Агафіі, Макара.*
***К.*** *ПАПЯЛЕЦ.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Жыццёвага вопыту любога таксіста хопіць, каб кіраваць светам, але дзякуй Богу, што ім падабаецца іх праца.**

У шлюбным агенцтве. Агент — кліентцы:

— Вось добрая кандыдатура — бландзін, 38 гадоў, рост 184 сантыметраў.

Жанчына:

— О! Цікава!

— Не курыць, майстар спорту па плаванні.

— Выдатны варыянт!

— Свой бізнес — аўтасэрвіс і сетка аўтазапраўак. Асабняк за горадам, дача на моры, два аўтамабілі, яхта...

— Проста цуд!

— З захапленняў — гуляе ў «Танкі».

— Давайце наступнага.

**Дзяўчына, якая дала абяцанне не есці пасля шасці, выпіла катлету.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.041. Індэкс 63850. Зак. № 649.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 17 лютага 2015 года.